Прыватнай паркоўкі ля пад'езда не бывае

СТАР.6



Замкі — наша сіла і слава

СТАР.9

Мсціслаў пастарэў на пару дзесяцігоддзяў

СТАР.9

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

31 САКАВІКА 2015 г. АЎТОРАК № 60 (27918) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

СВАЯ НОША...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй ШОРАЦ, старшыня Мінгарвыканкама:

«Жыхары і госці сталіцы павінны арыентавацца ў гістарычным цэнтры Мінска. Для гэтага ў цэнтры неабходна ўстанавіць інтэрактыўныя экраны, з дапамогай якіх можна будзе ўбачыць, дзе размяшчаюцца музеі, галерэі, аб'екты грамадскага харчавання, крамы з сувенірамі і гэтак далей. Сёння ў склад гістарычнага цэнтра горада ўваходзяць Ракаўскае і Троіцкае прадмесці, Верхні горад і прылеглыя да яго кварталы, Мінскае замчышча. На тэрыторыі гістарычнага цэнтра выканана рэканструкцыя і рэстаўрацыя 96 аб'ектаў. У 2014 годзе на тэрыторыі Верхняга горада з'явіліся скульптуры «Войт» і «Гарадскія шалі». Сёлета тут плануецца ўстанавіць скульптуру ў гонар 500-годдзя з'яўлення на водах ракі Свіслач абраза Божай Маці і помнік кампазітару Станіславу Манюшку».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.03.2015 г.

Долар ЗША	14740,00	▲
Еўра	15970,00	▲
Рас. руб.	251,50	▼
Укр. грыўня	629,51	▲

УЗАЕМНЫ ІНТАРЭС

Наша краіна зацікаўлена ў інтэнсіфікацыі ўзаемадзеяння з Архангельскай вобласцю

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з губернатарам расійскага рэгіёна Ігарам Арловым, паведамляе БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускі бок разглядае гэты першы візіт кіраўніцтва Архангельскай вобласці ў Беларусь як важны крок у развіцці ўсебаковых адносін. «Упэўнены, што разам нам удасца актывізаваць наша супрацоўніцтва, надаць імпульс кантактам на ўсіх узроўнях улады і адкрыць больш шырокія магчымасці для нашых вытворцаў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Знешнегандлёвыя сувязі Беларусі з Архангельскай вобласцю развіваюцца вельмі дынамічна. Па выніках 2014 года ўзаемны тавараварот у параўнанні з 2013 годам вырас больш як на 15 працэнтаў і перасягнуў $200 млн. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ёсць пэўны дысбаланс, адмоўнае сальда не на карысць Беларусі. «Думаю, што нам трэба сур'ёзна ў выніку гэтага візіту падумаць над тым, каб збалансаваць наш тавараварот», — сказаў беларускі лідар.

На думку Прэзідэнта, у Беларусі і Архангельскай вобласці вельмі значныя перспектыўныя напрамкі супрацоўніцтва. Перш за ўсё, размова можа ісці аб павелічэнні паставак беларускай тэхнікі. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што свае паслугі, а таксама самыя сучасныя праекты будынкаў і збудаванняў могуць прапанаваць беларускія будаўнікі. Акрамя таго, Беларусь гатова пастаўляць сельскагаспадарчую прадукцыю і ў цэлым працаваць над умацаваннем сельгасгаліны Архангельскай вобласці. «Словам, вельмі шмат напрамкаў, якія могуць быць запатрабаваны вамі. Упэўнены, што сферы ўзаемных інтарэсаў значна шырэйшыя», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка разлічвае, што ў час візіту дэлегацыі Архангельскай вобласці ў Беларусь будуць дасягнуты дамоўленасці, рэалізацыя якіх дасць магчымасць павысіць плённасць адносін.

У сваю чаргу Ігар Арлоў пацвердзіў інтарэс Архангельскай вобласці да развіцця ўсебаковага супрацоўніцтва з Беларуссю.

Падпісаны ўказ, які прадаўжае работу ІП без пацвярджальных дакументаў на тавары

Прэзідэнт Беларусі 30 сакавіка падпісаў указ №143, якім прадугледжана прадаўжэнне да 1 студзеня 2016 года пераходнага перыяду, на працягу якога індывідуальным прадпрымальнікам прадастаўлена права рэалізаваць астаткі тавараў, увезеных без пацвярджальных дакументаў. Адпаведныя змяненні і дапаўненні ўнесены ва ўказ ад 16 мая 2014 года №222 «Аб рэгуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці і рэалізацыі тавараў індывідуальнымі прадпрымальнікамі і іншымі фізічнымі асобамі», паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Пры рэалізацыі тавараў без пацвярджальных дакументаў устаноўлена прымяненне павышаючага каэфіцыента 2 пры вылічэнні адзінага падатку, а таксама спагнанне падатку на дабаўленую вартасць у фіксаванай суме з яго павелічэннем у чатыры этапы за кошт прымянення наступных павышаючых каэфіцыентаў:

2 — за перыяд з 1 па 31 сакавіка 2015 года;

2,5 — за перыяд з 1 красавіка па 30 чэрвеня 2015 года;

3 — за перыяд з 1 ліпеня па 30 верасня 2015 года;

4 — за перыяд з 1 кастрычніка па 31 снежня 2015 года.

У мэтах стымулявання індывідуальных прадпрымальнікаў набываць прадукцыю ў легальных вытворцаў і пастаўшчыкоў для тых з іх, якія будуць мець дакументы на ўсе тавары, што рэалізуюцца, дазваляецца перайсці на спрошчаную сістэму падаткаабкладання або з 1 красавіка, або з 1 ліпеня, або з 1 кастрычніка 2015 года.

Акрамя таго, ва ўказе дакладна рэгламентуецца рэалізацыя тавараў фізічнымі асобамі Беларусі і замежнымі грамадзянамі.

У мэтах спынення неарганізаванай рэалізацыі тавараў фізічнымі асобамі ўводзіцца забарона на продаж тавараў на вуліцах, стадыёнах, у скверах, парках, грамадскім транспарце або ў іншых грамадскіх месцах, за выключэннем рэалізацыі тавараў у месцах, установленых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

ДА ВЕДАМА ДЭПУТАТАЎ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Сёмая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання пачне сваю работу 2 красавіка 2015 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом урада, Авальная зала).

Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 2 красавіка 2015 года з 9.15 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.

■ Курсавая розніца

РАСІЙСКІ РУБЕЛЬ «АДБАЯЎСЯ»?

А еўрапейскую валюту пасуне больш моцны долар

Сітуацыя на сусветным валютным рынку, на думку экспертаў, сёння складаная. Зрэшты, як заўсёды. Аднак ёсць і нестандартны складнік падзей. Звычайна, вялікую ролю тут іграе пэўны спекулятыўны кампанент: нехта з высокіх чыноўнікаў нешта сказаў — і на табе, рэакцыя ў выглядзе скокаў курсу. Цяпер усё трошку па-іншаму. Выказванні, зразумела, таксама маюць вагу, але наперад выйшлі рэальныя эканамічныя паказчыкі. Вельмі яскравым прыкладам з'яўляецца расійскі рубель, які апошнія два месяцы ўмацоўваўся, нягледзячы на працяг падзення цэн на нафту: пэўная рэанімацыя эканомікі дала плён. Такім жа чынам цяжкасці еўрапейскай эканомікі падрываюць давер да еўра. Чаго чакаць у найбліжэйшы час на нестабільным валютным рынку, высвятляў карэспандэнт «Звязды».

СТРАКАТАСЦЬ НЕ НА КАРЫСЦЬ

Пачнём з перспектыў традыцыйных міжнародных валют. Пара еўра і долара паказвае апошнім часам жорсткую барацьбу. І хаця еўра пакуль што каштуе болей за долар, тыя, хто ўкладваўся ў еўрапейскую валюту, апошнім часам сыходзяць у мінус. «Амерыканская эканоміка расце. Еўропа ў вельмі цяжкім становішчы. Таму мы чакаем, што да канца гэтага года суадносіны еўра і долара прыйдуць да 1,1», — сцвярджае **віцэ-прэзідэнт кампаніі «Тэлетрэйд» Дзмітрый ДРЫГАЙЛА.**

СТАР.6

■ Надвор'е

Красавік пажартуе мокрым снегам

А ўначы на выхадныя яшчэ і падмарозіць да мінус 5 градусаў

На гэтым тыдні на тэрыторыю нашай краіны завітаюць актыўныя атмасферныя франты з боку Заходняй Еўропы і будзе няўстойлівае і халоднае надвор'е, паведаміў начальнік аддзела метыяпрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Аляксандр БЯГАНСКІ.

Таму ў аўторак у нас будзе ісці дождж, а часам магчымы дождж з мокрым снегам. У асобных раёнах чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15-18 м/с. Максімальная тэмпература паветра складзе 4-10 цяпла. У сераду і чацвер часам будзе ісці дождж з мокрым снегам. Разам з ападкамі нас чакае выпрабаванне моцным ветрам парывамі да 15-20 м/с. У чацвер уначы і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра 1 і 2 красавіка ўначы будзе вагацца ад мінус 2 да плюс 3 градусаў, удзень — 1-8 цяпла. Адразу здаецца, што не па сезоне халаднавата, аднак... Сіноптыкі адзначаюць, што такі тэмпературны фон якраз і адпавядае кліматычнай норме першых дзён красавіка.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пятніцу і на выхадныя надвор'е яшчэ пагоршыцца. Так, 3 красавіка паўсюдна будзе ісці дождж ці мокры снег. Уначы і раніцай месцамі слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад 0 да мінус 5 градусаў, удзень — ад 1 да 7 цяпла. Захаваецца такі тэмпературны фон і ў суботу з нядзеляй. Вось толькі мокры снег з дажджом чакаецца выключна месцамі.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

«Газпрам» папрасіў аб зніжцы для Украіны

«Газпрам» звярнуўся ва ўрад Расіі з просьбай аб прадастаўленні зніжкі на газ для Украіны тэрмінам на тры месяцы. Пра гэта заявіў кіраўнік кампаніі Аляксей Мілер. Ён адзначыў, што магчымасць прадстаўлення зніжкі для Украіны прадугледжана дзейным кантрактам паміж «Газпрамам» і «Нафтагазам». «Тэрмін тры месяцы мы лічым аптымальным, таму што апошнім часам назіраецца высокая дынаміка кошту на газ», — дадаў Мілер. 30 сакавіка стала вядома, што «Нафтагаз Украіны» накіраваў ліст «Газпраму» з прапановай падоўжыць дзеянне асаблівых умоў паставак да канца наступнага восеньска-зімовага перыяду. У Кіеве падкрэслілі, што гэтая ініцыятыва зыходзіць ад Еўракамісіі. На гэта прэс-сакратар прэзідэнта Расіі Дзмітрый Пяскоў заявіў, што Масква разгледзіць прапанову «Нафтагаза» аб прадаўжэнні дзеяння «зімовага пакета». Як удакладніў расійскі міністр энергетыкі Аляксандр Новак, з 1 красавіка цана на газ для Украіны складзе 348 долараў за тысячу кубаметраў. Да гэтага тэрміну Масква абмяркуе магчымасць прадастаўлення зніжкі ў 100 долараў.

Вільнюс назвалі самым танным для турыстаў еўрапейскім горадам

Сталіцу Літвы назвалі самым танным для турыстаў горадам Еўропы. Аб гэтым паведамляецца на сайце брытанскай паштовай службы Post Office. Кампанія правяла даследаванне, па выніках якога высветлілася, што правесці выхадныя ў Вільнюсе можна ў сярэднім за 100 еўра. Другое месца ў рэйтынгу заняў Будапешт (119,77 еўра), трэцяе — Рыга (120,39 еўра). Пры складанні рэйтынгу аўтары ўлічвалі кошт дзвюх начэй у трохзоркавым гатэлі, трансферу з аэрапорта, вячэры з віном, экскурсій і транспарту ў горадзе. Самым дарагім еўрапейскім горадам быў названы Стакгольм. Каб правесці выхадныя ў сталіцы Швецыі, падарожніку ў сярэднім можа спатрэбіцца больш за 310 еўра.

Польскіх дэпутатаў паставяць пад ружжо

Спікер парламента Польшчы Радаслаў Сікорскі заявіў, што парламентарыі па жаданні змогуць прайсці курс ваеннай падрыхтоўкі, адзначыўшы, што «цяжкія часы» яшчэ не скончыліся, паведамляе Gazeta Wyborcza. Сікорскі і міністр абароны Томаш Сіманяк прапанавалі заканатворцам у маі 2015-га прайсці курс баявой падрыхтоўкі. Таксама такую падрыхтоўку змогуць прайсці палякі ва ўзросце ад 18 да 50 гадоў па ўсёй краіне. У пачатку студзеня стала вядома, што сёлета ў Польшчы на ваенныя вучэнні будуць прызваны суддзі, пажарныя, супрацоўнікі турмаў, а таксама чыноўнікі, паведамляе Rzeczpospolita.

Карымаў набраў 90,39% галасоў

Цэнтрвыбаркам Узбекістана агучыў папярэднія вынікі прэзідэнцкіх выбараў. Паводле іх, дзейны прэзідэнт рэспублікі Іслам Карымаў атрымаў перамогу, набраўшы 90,39 працэнта галасоў. Яўка на галасаванні таксама перавысіла 90 працэнтаў — у ім прынялі ўдзел 18,942 мільёна грамадзян Узбекістана.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Фолевая кіслата зніжае рызыку інсульту

У даследаванні спецыялістаў з бальніцы Ленакс Хіл прынялі ўдзел больш за 20 000 пацыентаў. Даследчыкі хацелі высветліць, як фолевая кіслата (вітамін B9) уплывае на рызыку развіцця інсульту. Даследаванне паказала: фолевая кіслата зніжала рызыку, прынамсі, у тых, хто прымаў энапрыл. Аднак спецыялісты лічаць, што яна можа змяншаць рызыку і сама па сабе. Так, верагодна, прадухіліць інсульт здольны звычайны вітамін. Фолевая кіслата змяшчаецца ў зялёнай ліставой гародніне, бабах і цытрусавых. Акрамя таго, існуюць розныя дадаткі з вітамінам B9. Доктар Уолтэр Уілет з Гарвардскай школы грамадскага здароўя адзначае: «Садавіна і гародніна багатыя на фолевую кіслату, а таксама калій і фітахімічныя злучэнні, якія таксама зніжаюць рызыку сардэчна-сасудзістых захворванняў».

КОРАТКА

Урад прадоўжыў на 2015 год пагадненне з Ашчадным банкам Расіі па падтрымцы экспарту беларускай тэхнікі.

Дзеючую методыку падаткаабкладання прыбытку ў Беларусі змяняць не плануецца.

У рэспубліцы плануецца ўвесці адміністрацыйную адказнасць для старшынь таварыстваў уласнікаў, якія парушаюць закон.

Больш за 100 тыс. вернікаў Беларусі прынялі ўдзел у святкаванні Уваходу Гасподняга ў Іерусалім — Вербнай (Пальмавай) нядзелі. Святочныя богаслужэнні прайшлі ў 333 пратэстанцкіх і каталіцкіх храмах краіны.

Маштабны спецыялізаваны кірмаш стокавых нехарчовых тавараў з удзелам вытворцаў з усіх рэгіёнаў рэспублікі пройдзе ў Мінску ў раёне Палаца спорту 18-19 красавіка.

■ Гандаль

БЕЛКААПСАЮЗ: у продажы выключна айчыннае

Крытычны імпарт тут усяго каля 7%

Доля беларускіх тавараў у крамах спажывецкай кааперацыі складае 93%, паведаміў старшыня праўлення Белкаапсаюза Валерый ІВАНОЎ.

Фота БЕЛТА.

У асноўным насельніцтва купляе тое, што вырабляецца ў нашай краіне, а імпартныя тавары, асабліва прадукты, у сельскай мясцовасці не каціруюцца, адзначыў кіраўнік ведамства. Да тавараў крытычнага імпарту ў сетцы кааперацыі адносяцца цытрусавыя, алей, некаторыя віды лікёра-гарэлачнай прадукцыі і іншых тавараў, якія не вырабляюцца ў Беларусі. А вось 99% тытунёвых вырабаў і мэблі, 98% безалкагольных напояў, 91% сокаў, 96% піва і макаронных вырабаў, 95% гародніны, якія прадаюцца ў крамах спажыўкааперацыі, з'яўляюцца таварамі айчыннай вытворчасці.

Сёлета ў сістэме Белкаапсаюза пачаў дзейнічаць адзіны аптова-лагістычны цэнтр менавіта для паставак у сістэму спажыўкааперацыі харчовых тавараў крытычнага імпарту. Яго стварэнне дазволіла зрабіць імпарт танейшым і тым самым істотна павялічыць рэалізацыю некаторых груп тавараў, у прыватнасці садавіны, рыбы і круп. Валерый Іваноў упэўнены, што ў бліжэйшы час рэгіянальныя прадстаўніцтвы аптова-лагістычнага цэнтра з'явяцца і ва ўсіх абласцях краіны.

Сяргей КУРКАЧ.

ISSN 1990 - 763X

■ Парламенцкі дзённік

ВОСТРАЕ ПЫТАННЕ

аб сучасным стане рэстаўрацыі

Дэпутаты наведалі Нацыянальны мастацкі музей і ацанілі, у якіх умовах працуецца беларускім рэстаўратарам. Візіт адбыўся ў межах выязнога пасяджэння Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры і навуцы.

«У красавіку ў парламент павінен паступіць праект Кодэкса аб культуры. Над ім мы працуем ужо на працягу года: знаёмімся з практыкай прымянення заканадаўства ў сферы культуры», — паведаміў старшыня камісіі Аляксандр Сягоднік. Парламентарый адзначыў, што будаўніцтва новых памяшканняў Нацыянальнага мастацкага музея прыцягвае ўвагу грамадзян. «Безумоўна, калі гэта цікавіць людзей, тады і дэпутатаў — у першую чаргу», — дадаў ён.

Дэпутат падкрэсліў, што Кодэкс аб культуры прадугледжвае ўсе напрамкі культурніцкай дзейнасці. Таму камісія працавала ў тым ліку і над зменамі і дапаўненнямі ў закон аб народнай творчасці, промыслах і рамёствах, бібліятэчнай справе, творчых саюзах. Дэпутат падкрэсліў, што пытанні аб зменах абмяркоўваліся з практыкамі, якія маюць непасрэднае дачыненне да гэтых сфер.

Асобная тэма пасяджэння — аднаўленне ўжо існуючых твораў. «Для нас вельмі балючае пытанне — гэта праблема рэстаўрацыі, захавання ўнікальных твораў мастацтва», — падзяліўся Уладзімір Пракапцоў, генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Ён растлумачыў, што сёння ў нашай краіне ідзе падрыхтоўка рэстаўратараў у двух ВНУ — Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў і Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

Але ў арганізацыі гэтай сферы не хапае сістэмнасці. Таму, напрыклад, не існуе перападрыхтоўкі па гэтай спецыяльнасці. Часта рэстаўрацыю праводзіць мастак, які не спецыялізуецца ў ёй. «Уявіце, што стаматолаг робіць працу хірурга», — метафарычна тлумачыць небяспеку такой сітуацыі дырэктар музея. І прапануе адно з канкрэтных выйсцяў — стварыць адпаведны цэнтр на базе музея, які будзе аказваць кваліфікаваныя паслугі па рэстаўрацыі.

Дэпутаты нездарма звярталіся асаблівую ўвагу не толькі на пытанні рэстаўрацыі, але і культуры ўвогуле. «І інтэрнэт, і камп'ютарныя гульні забіраюць наш вольны час. А ёсць тое каштоўнае, што павінна быць у сэрцы кожнага. Куды мы павінны павярнуць сябе, сваіх родных, каб запанавала сапраўдная духоўнасць», — тлумачыць матывацыю паляпшаць стан культуры намеснік старшыні камісіі Наталля Кучынская.

Вераніка ПУСТАВІТ.

НАД ЧЫМ ПРАЦУЮЦЬ ДЭПУТАТЫ

Мы працягваем цікавіцца ў парламентарыяў, над якімі законапраектамі працуюць яны напярэдадні сесіі. Як праінфармавала Наталля КУЧЫНСКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы, дзейнасць яе камісіі даволі шматбаковая. Так, дэпутаты актыўна рыхтуюцца да сёмай парламенцкай сесіі, распрацоўваюць законапраекты на перспектыву і не забываюць пра сваю выбарчую акругу.

— Працуе рабочая група па разглядзе Закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях прававой абароны таварных знакаў і знакаў абслугоўвання», у нашым дэпутацкім партфелі знаходзіцца праект закона Рэспублікі Беларусь «Аб ратыфікацыі Праграмы супрацоўніцтва ў сферы адукацыі паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Венгрыі на 2014 — 2016 гады», — паведаміла дэпутат. — Адзначу, што Праграма вызначае наступныя напрамкі двухбаковага супрацоўніцтва ў сферы адукацыі: інфармацыйны абмен, развіццё прамых кантактаў паміж арганізацыямі сістэмы адукацыі, удзел педагогаў і навучэнцаў у рэспубліканскіх і міжнародных мерапрыемствах. Згодна з Праграмай, пашыраюцца магчымасці для навучання грамадзян ва ўстановах адукацыі абедзвюх краін. Так, штогод Беларусь накіроўвае 20 студэнтаў першай ступені вышэйшай адукацыі, 25 магістрантаў і 5 аспірантаў для набыцця адукацыі ў Венгрыі, а венгерскі бок штогод накіроўвае ў беларускія навучальныя ўстановы 10 студэнтаў першай ступені вышэйшай адукацыі.

Па словах парламентарыя, у дэпутатаў яе камісіі сёння два асноўных кірункі працы.

— Першы — работа сумесна з Міністэрствам адукацыі па ўнясенні дапаўненняў і змен у Кодэкс аб адукацыі, а таксама распрацоўка шэрагу захадаў па павышэнні сацыяльнага статусу педагога, — расказала Наталля Кучынская. З гэтай нагоды запланаваны сумесныя калегіяльныя пасяджэнні. На мінулым тыдні члены камісіі ўдзельнічалі ў пасяджэнні прэзідыума Цэнтральнага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, дзе дзяліліся вопытам рэгіёнаў і ўносілі прапановы па павышэнні сацыяльнага статусу настаўніка.

Другі напрамак — работа над нормамі праекта Кодэкса аб культуры, які паступіць у Палату прадстаўнікоў у красавіку бягучага года.

— Прадстаўнікі нашай камісіі ўваходзілі ў рабочую групу па распрацоўцы праекта Кодэкса аб культуры. Праект аб'яднаў каля 70 нарматыўных прававых актаў рознай юрыдычнай сілы, з якіх 7 законаў, 8 указаў Прэзідэнта, больш за 20 пастаноў урада краіны і больш за 30 нарматыўных актаў Міністэрства культуры. У першым квартале 2015 года ў рамках падрыхтоўкі да разгляду гэтага комплекснага дакумента ў сферы культуры наша камісія правяла выязныя пасяджэнні ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, у майстэрні скульптара Івана Міско і на месцы стварэння скульптараў Канстанцінам Касцючэнкам кампазіцыі «Брама памяці». На кантролі камісіі знаходзіцца выкананне рэкамендацый «круглага стала» па праблемах чорнай археалогіі і аховы археалагічнай спадчыны, які правялі ў парламенце члены камісіі па адукацыі, культуры і навуцы разам з прадстаўнікамі Інстытута гісторыі і Міністэрства культуры ў мінулым годзе.

Што да працы ў акругах, то дэпутаты камісіі ініцыююць шматлікія патрыятычныя акцыі, прымеркаваныя да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

— Напрыклад, у сваім Ашмянскім раёне ў мінулую суботу я разам з лясніцтвам, аддзелам адукацыі, раённым БРСМ правяла акцыю «Наш лес — Вялікай Перамозе». Мы ладзім такую акцыю трэці год і ганарымся, што лес расце вельмі добра. На май запланавала велапрабег па мясцінах, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной, фотаконкурс «Вялікая Перамога ў гісторыі маёй сям'і».

Надзея ЮШКЕВІЧ

■

З АДКРЫТАЙ ПАЗІЦЫЯЙ І ДОБРЫМ ПАЧАТКАМ

павінна, на думку старшыні грамадскага аб'яднання «Белая Русь», быць арганізавана кампанія па выбарах Прэзідэнта

«Белая Русь» ужо пачала падрыхтоўку да выбарчай кампаніі. Як будзе ўдзельнічаць адно з самых буйных грамадскіх аб'яднанняў краіны ў падрыхтоўцы да выбараў, якімі будуць пікеты і чым будзе адрознівацца гэтая кампанія ад мінулых, «Звязда» падчас кадравага дня арганізацыі расказаў Аляксандр РАДЗЬКОЎ, памочнік Прэзідэнта краіны, старшыня Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь».

Фота БЕЛТА.

— Як плануе «Белая Русь» удзельнічаць у выбарчай кампаніі?

— Мы — грамадскае аб'яднанне палітычнага кірунку. Наша задача — гэта падтрымка Прэзідэнта ў яго палітыцы, кіраўніцтве краінай, у давядзенні яго ўстановак і выкананні праграм. І, безумоўна, падтрымка на такіх значных падзеях, як выбары.

Пакуль яшчэ не выбраны кандыдаты ў прэзідэнты, ідзе толькі падрыхтоўчая праца. Але, мяркуючы, што такая работа ўсё роўна будзе, мы не хочам губляць час і сістэмна, як палітычная арганізацыя, рыхтуемся да палітычнай кампаніі. Калі Аляксандр Рыгоравіч будзе вылучаць сваю кандыдатуру, мы будзем гатовы арганізацыйна, структурна, палітычна і ідэалагічна яго падтрымаць. Для гэтага ў нас ёсць вопыт удзелу ў выбарах — прэзідэнцкіх 2010 года, парламенцкіх, у выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў.

У нас ужо напрацаваны адпаведныя тэхналогіі. Напрыклад, такі спосаб работы са зваротамі, як грамадская прыёмная. Мы арандуем адпаведнае памяшканне, куды людзі могуць звярнуцца з нейкім пытаннем, прапановай, скаргай. Калі ж пачынаецца палітычная кампанія, грамадскія прыёмныя разварочваюцца ў штабы. Прычым усё гэта ўтрымліваецца за кошт нашых узносаў — мы не атрымліваем датацый з бюджэту або з іншых крыніц.

Мы, як грамадскае аб'яднанне, рыхтуем свой удзел у выбарах у якасці членаў выбарчых камісій, назіральнікаў. Мы можам сродкамі нашага фонду падтрымаць фінансава свайго кандыдата ў прэзідэнты. Па рашэнні прэзідыума арганізацыі мы можам адпаведную суму перавесці ў фонд гэтага кандыдата.

«Белая Русь» практыкуе і будзе практыкаваць збор подпісаў праз актыў — гэта таксама агітацыйная праца. Нас 150 тысяч, таму праблем з подпісамі ўвогуле не ўзнікае. Тым не менш мы будзем выходзіць на вуліцу з пікетамі — у нас ёсць адпаведная атрыбутыка. Ёсць вопыт такой працы і адпаведныя выканаўцы: сярод членаў «Белай Русі» — артысты Вялікага тэатра, драматычных тэатраў, ёсць вучоныя, ёсць грамадскія дзеячы, пісьменнікі, настаўнікі, ўрачы, кіраўнікі — яны ўмеюць праводзіць працу з людзьмі.

Такога кшталту палітычныя кампаніі мы выкарыстоўваем і як праверку людзей на магчымасць праявіць сябе. Гэта паказвае ўпэўненасць у тактоўцы тых ідэй, за якія ты стаіш. Палітычная кампанія — гэта момант ісціны. Калі такая кампанія арганізавана і арганізавана ідэалагічна правільна, шчыра і з энтузіязмам, то тады будзе і вынік.

— Падчас выступлення перад старшынямі раённых арганізацый «Белай Русі» вы падкрэслілі, што пікеты павінны быць арганізаваны так, каб людзям гэта было цікава, блізка...

— Выбарчая кампанія, асабліва прэзідэнцкія выбары, павінна быць і арганізавана, і праведзена з адкрытай пазіцыяй, з добрым пачаткам, з перспектывай для кожнага чалавека ў прыватнасці і для краіны ў цэлым. Яна павінна быць з пазітывам. Нават калі і апазіцыя праводзіць свае пікеты, не павінна быць агрэсіўнасці, празмернага ўздзеяння на людзей. У кожнага ёсць права выбару.

Мы часта бачым у некаторых кандыдатаў лозунгі абразлівыя, непрыемныя для іншых. Запрашаюць у выбарчую кампанію нейкіх адыёзных асоб для таго, каб выкінуць гэтыя лозунгі, праводзяць акцыі і гэтым перашкаджаюць людзям — на вакзале, у падземным пераходзе... Гэта назойліва, людзі такога не ўспрымаюць. Мы так не хочам. Трэба, каб усё праводзілася ад душы, каб было цікава. Калі мы, напрыклад, праводзім нейкую акцыю, то робім гэта так, каб не перашкаджаць грамадскаму парадку, працы таго або іншага прадпрыемства.

— Ці будзе гэтая выбарчая кампанія значна адрозніваць ад ранейшых?

— Выбарчая кампанія — у мясцовыя Саветы, у Нацыянальны сход, а ўжо тым больш прэзідэнцкая кампанія — гэта заўсёды актыўная фаза жыцця грамадства. Ідзе вызначэнне будучыні краіны, абмеркаванне праграм, выбар лідара нацыі, ідзе канкурэнцыя паміж прэтэндэнтамі на пасаду прэзідэнта... Таму, натуральна, выбарчая кампанія — гэта заўсёды актывізацыя жыцця і кожнага чалавека, і ў цэлым грамадства. Безумоўна, гэтыя выбары таксама пройдуць актыўна, цікава.

Людзі ўжо многае зразумелі — і гэта таксама будзе адбівацца. Мы ўпэўнены, што давяраць трэба чалавеку, які сябе зарэкамендаваў, — сваім жыццём, сваімі справамі, іх вынікамі. Дапусцім, будзе ўжо менш цікавасці да тых кандыдатаў у прэзідэнты, якія нічым сябе не праявілі, а калі і праявілі, то гэта, як правіла, былі заклікі да сутыкненняў, да «Плошчы»... Даверу ім ужо будзе значна менш, таму што такія падыходы, як жыццё паказала, прыводзяць да кровапраліцця, нават да вайны. Думаю, падчас гэтай выбарчай кампаніі атмасфера будзе больш спакойнай, падыход — больш грунтоўным, больш будзе разважлівых і разумных дзеянняў і ў агітацыі, і ў выбары.

— Нашу краіну актыўна наведваюць еўрапейскія палітыкі, гавораць шмат і пераканаўча пра адлігу ў стасунках паміж Беларуссю і Еўрасаюзам... Падобная сітуацыя была і напярэдадні мінулых прэзідэнцкіх выбараў. Ці можна сёння чакаць гэтай адлігі? Той раз яна так і не наступіла...

— Жыццё многаму вучыць. Лепшага настаўніка, чым яно, знайсці складана. І еўрапейцы за гэты час шмат што зразумелі і ўсвядомілі. Дзякуючы нават таму, што наша краіна аказалася вельмі падыходзячай, правільнай пляцоўкай для наладжвання міру ў суседняй краіне. Гэта таксама ў многім заслуга і Прэзідэнта Беларусі, і ўсёй яго палітыкі.

Мы не хочам, каб нам навязвалі чужыя вобразы і ідэалогію, наш народ выпакутаваў права і на самавызначэнне, і на незалежнасць, і на незалежную палітыку. Паважайце нас. Мы заўсёды ішлі з гэтым. Можаце нам дапамагчы? Мы не супраць, дапамажыце. Хочаце з намі супрацоўнічаць — калі ласка, супрацоўнічайце. Але не навязвайце нам тыя каштоўнасці, якія ад пачатку чужыя, — тыя ж адналюбыя шлюбы. Не наша гэта ментальнасць. Але паважайце нас. Тыя ж санкцыі пасля выбараў 2010 года... Натуральна, для кожнага з нас яны былі незразумелымі. Нават тыя каштоўнасці, якія імкнуцца нам навязаць і якія называюць дэмакратычнымі, не заўсёды, з нашага пункту гледжання, спрыяюць развіццю.

Апошняе пяцігоддзе паказала, што, сапраўды, мы развіваемся, і паважаць нас за гэта трэба. Таму, думаю, праца і Прэзідэнта, і розных структур, палітычных партый і аб'яднанняў, у тым ліку, апазіцыйных, і кожнага з нас паказваюць, што мы маем права на свой шлях, сваю палітыку. Тым больш што мы неагрэсіўныя, не прэтэндуем на чужыя землі.

Наша праца, наша прыстойнасць, наша вытрымка — усё гэта паказвае, што трэба неяк па-іншаму будаваць адносіны. Я ўпэўнены, што выбары 2015 года будуць праходзіць з улікам гэтага вопыту. І пасля іх адносіны паміж нашай краінай і Еўропай будуць развівацца больш плённа, вынікова і з большай павагай.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

ДЗЕ ЗНАЙСЦІ РАБОТУ, МОЛАДЗІ ПАДКАЖУЦЬ У... ТРАЛЕЙБУСЕ

У Магілёве становіцца ўсё больш «тэматычнага» грамадскага транспарту.

Не паспелі магіляўчане прызвычаіцца да таго, што ў горадзе з'явіўся тралейбус ад праваахоўнікаў, дзе перыядычна праводзіцца антыспайсавая прапаганда, як на вуліцы выехаў яшчэ адзін — ад гарадскога камітэта БРСМ. Цікава, што абедзве машыны працуюць на адным і тым жа маршруце №2. Ён адзін з самых працяглых і ажыўленых у Магілёве. Тэарэтычна на працягу месяца ім некалькі разоў можа скарыстацца кожны з магіляўчан. Апазнаць маладзёжны тралейбус можна па жыццярадасным дызайне, які распрацавала таленавітая дзяўчына з Магілёва Кацярына Табанюхіна.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

■ Калі вярстаўся нумар

НІЧЫЯ З ГАБОНАМ

У панядзелак зборная Беларусі ў турэцкім Белеку правяла таварыскі матч з нацыянальнай камандай Габона, якую трэніруе вядомы ў мінулым партугальскі футбаліст Жоржэ Кошта. У параўнанні з сустрэчай у Македоніі склад нашай каманды змяніўся. Так, у складзе нашай зборнай дэбютавалі галкіпер Андрэй Гарбуноў, нападаючыя Аляксандр Макась і Мікалай Януш. У выніку пераможцу каманды не выявілі і завяршылі спарынг безгалявой нічыёй.

Информация о результатах финансово-хозяйственной деятельности за 2014 год

ОАО «Вишневка-2010»

в млн.руб.

№ п/п	Наименование показателей	На 31.12.2014 года	На 31.12.2013 года
1.	Долгосрочные активы	49 192	50 176
	в том числе		
	долгосрочная дебиторская задолженность	8 624	6 695
2.	Краткосрочные активы	57 278	41 162
	в том числе		
	дебиторская задолженность	2 935	1 481
	денежные средства	123	58
3.	Собственный капитал	51 113	48 023
	в том числе		
	уставный фонд	47 090	25 686
	нераспределенная прибыль	-1 968	7 281
4.	Долгосрочные обязательства	13 371	9 312
5.	Краткосрочные обязательства	41 986	34 003
	в том числе		
	краткосрочная кредиторская задолженность	37 791	33 359
	Выручка от реализации продукции (работ, услуг)	17 832	25 213
6.	Себестоимость реализованной продукции	29 404	33 120
7.	Прибыль от реализации продукции (работ, услуг)	-13 716	-11 009
8.	Убыток текущей деятельности	3 518	8 516
9.	Прибыль от инвестиционной и финансовой деятельности	1 275	8 164
10.	Налоги и сборы, уплаченные из прибыли	-	-
11.	Чистая прибыль (убыток)	-8 923	5 034
12.	Прибыль на акцию, руб.	-	-
13.	Обеспеченность акций имуществом общества в тыс. руб.	23,8	23,9
14.	Среднесписочная численность, человек	155	165

Аудиторское заключение № 4/15 ОА от 25.03.2015 г.

Директор К.А. Спариш

Гл. бухгалтер Е.И. Змитрович

УНП 600041880

ОАО «БЕЛГАЛАНТЕРЕЯ» г. Минск

БАЛАНС по состоянию на 1 января 2015 г. млн руб.

АКТИВ	Сумма	ПАССИВ	Сумма
1. Основные средства Справочно: первоначальная стоимость – 16 347 амортизация – 7 381	8 966	1. Уставный капитал	1 124
		2. Резервный капитал	21
		3. Добавочный капитал	7 476
2. Нематериальные активы	9	4. Нераспределенная (неиспользованная) прибыль	1 080
3. Финансовые вложения	6		
4. Запасы, в т.ч.: материалы – 158 товары – 5 663	5 821	5. Краткосрочные кредиты	411
5. Расходы будущих периодов	157	6. Задолженность перед участниками (учредителями)	12
6. Денежные средства	83	7. Краткосрочная кредиторская задолженность	12 013
7. Краткосрочная дебиторская задолженность	7 095		
БАЛАНС	22 137	БАЛАНС	22 137

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01.01. 2014 г. по 31.12.2014 г. млн руб.

Наименование показателя	Код стр.	За отчетный период
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	67 280
Начисленный НДС, исчисляемый из выручки от реализации товаров, работ, услуг		11 070
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	020	46 270
Расходы на реализацию	050	8 476
Прибыль (убыток) от реализации товаров, работ, услуг	**060**	**1 464**
Прочие доходы по текущей деятельности	070	32
Прочие расходы по текущей деятельности	080	380
Прибыль (убыток) от текущей деятельности	090	1 116
Доходы по инвестиционной деятельности	100	54
Расходы по инвестиционной деятельности	110	32
Доходы по финансовой деятельности	120	25
Расходы по финансовой деятельности	130	185
Прибыль до налогообложения	**150**	**978**
Налог на прибыль	160	248
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли	200	1
Чистая прибыль (убыток)	**210**	**729**

Информация о дивидендах и акциях:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	72,9	11
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	1 492	227
Обеспеченность акции имуществом общества	тысяч рублей	198,5	184
Количество акционеров, всего	лиц	315	370
В том числе: юридических лиц	лиц	4	2
физических лиц	лиц	311	368
Среднесписочная численность работников	человек	84	88

Основной вид деятельности – оптовая торговля.

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год: **27 марта 2015 года.**

УНП 100230667

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

ОАО «Барановичский молочный комбинат»

Бухгалтерский баланс на 1 января 2015 г.

АКТИВ	Код стр.	На 31.12.2014 Млн руб.	На 31.12.2013 Млн руб.
I.ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	235788	210406
Нематериальные активы	120	62	38
Доходные вложения в материальные ценности	130	249	254
Вложения в долгосрочные активы	140	44488	39775
Долгосрочные финансовые вложения	150	37677	25263
Прочие долгосрочные активы	180	1	2
ИТОГО по разделу I	**190**	**318265**	**275738**
II.КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	51207	44669
Расходы будущих периодов	230	1102	254
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам	240	4	8
Краткосрочные дебиторская задолженность	250	88712	69698
Краткосрочные финансовые вложение	260		8466
Денежные средства и их эквиваленты	270	31052	13702
ИТОГО по разделу II	**290**	**172077**	**136797**
БАЛАНС	**300**	**490342**	**412535**
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный фонд	410	25290	25290
Резервный фонд	440	21331	21331
Добавочный фонд	450	175370	175432
Нераспределенная прибыль	460	175806	112582
ИТОГО по разделу III	**490**	**397797**	**334635**
ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займа	510	21015	21338
Прочие долгосрочные обязательства	520		25
Отложенные налоговые обязательства	530		852
Доходы будущих периодов	540		
ИТОГО по разделу IV	**590**	**21015**	**22215**
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	32431	19899
Кредиторская задолженность	630	39099	32313
Доходы будущих периодов	650		2884
Прочие краткосрочные обязательства	670		589
ИТОГО ПО РАЗДЕЛУ V		**71530**	**55685**
БАЛАНС	**700**	**490342**	**412535**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателей	Код стр.	За отчет. период Млн. руб
I ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ		
Выручка от реализации товара, продукции, работ, услуг (за вычетом налога)	010	689326
Себестоимость реализованных товаров, продукции	020	573108
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	060	81306
Прочие доходы по текущей деятельности	070	411991
Прочие расходы по текущей деятельности	080	416919
ПРИБЫЛЬ(УБЫТОК) от текущей деятельности	090	76378
ПРИБЫЛЬ(УБЫТОК) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности	150	2429
ПРИБЫЛЬ(УБЫТОК) до налогообложения	160	78807
Налог на прибыль	170	14631
Изменение отложенных налоговых обязательств	190	852
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ(УБЫТОК)	**210**	**65020**

Директор В.И. Ракуть

Главный бухгалтер Л.Е. Козлова

УНП 200167548

Годовой отчет ОАО «ЗГМП» за 2014 год

Полное наименование эмитента: открытое акционерное общество «Завод гидромеханических передач». **Адрес:** 220070, г. Минск, ул. Буденного, 1А, здание 19, ком. 1. Тел. для справок (8-017) 330-19-22. УНП 192296722 **Единица измерения:** млн. рублей.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2015 года

Актив	Код стр.	На 31 декабря 2014 г.	На 31 декабря 2013 г.
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110		
Нематериальные активы	120		
Доходные вложения в материальные активы	130		
Вложения в долгосрочные активы	140	10	
Долгосрочные финансовые вложения	150		
Долгосрочная дебиторская задолженность	170		
Прочие долгосрочные активы	180		
ИТОГО по разделу I	**190**	**10**	
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210		
Расходы будущих периодов	230	396	
Налоги по приобретенным товарам	240	5	
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	11500	
Краткосрочные финансовые вложения	260		
Денежные средства и их эквиваленты	270	706	
Прочие краткосрочные активы	280		
ИТОГО по разделу II	**290**	**12607**	
БАЛАНС	**300**	**12617**	
Собственный капитал и обязательства	**Код стр.**	**На 31 декабря 2014 г.**	**На 31 декабря 2013 г.**
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	1000	
Резервный капитал	440		
Добавочный капитал	450		
Нераспределенная прибыль	460	63	
ИТОГО по разделу III	**490**		
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510		
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520		
Отложенные налоговые обязательства	530		
Прочие долгосрочные обязательства	560		
ИТОГО по разделу IV	**590**		
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610		
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	11554	
Доходы будущих периодов	650		
ИТОГО по разделу V	**690**	**11554**	
БАЛАНС	**700**	**12617**	

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 01 января 2015 года

Наименование показателей	Код. стр.	За 2014 год	За 2013 год
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010		
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	020		
Управленческие расходы	040		
Расходы на реализацию	050		
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	060		
Прибыль (убыток) от текущей деятельности	090		
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности	140	77	
Прибыль (убыток) до налогообложения	150	77	
Налог на прибыль	160	(14)	
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	200		
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	210	63	
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220		
Совокупная прибыль (убыток)	240		

Информация о дивидендах, количестве акционеров, задолженности

Наименование показателя	Ед.изм.	За отчетный период
Доля государства в уставном фонде эмитента	%	100
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	млн. руб.	-
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	руб.	-
Обеспеченность акции имуществом общества	тыс. руб.	-
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	шт.	1000
Просроченная дебиторская задолженность	млн. руб.	-
Просроченная кредиторская задолженность	млн. руб.	-
Численность акционеров	ед.	2
Основной вид деятельности: производство ГМП и автомобильных принадлежностей		

Генеральный директор И.М. Гуринович

Главный бухгалтер А.Н. Свечников

Данные отчетности подтверждены – аудитор Демидчик Наталья Леонидовна, квалификационныйаттестат аудитора № 0001525 от 05.11.2007 года, выдан Министерством финансов Республики Беларусь, регистрационный №1450220039, г. Минск, ул. Чкалова, д.35, кв. 10, тел. моб. 8-029-296-54-26.

ОАО «Слуцкий льнозавод»

Учетный номер плательщика: 690657228
Вид экономической деятельности: 17140,01116
Единица измерения: млн. руб. Адрес: г. Слуцк. ул. Ленина 300

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС за январь–декабрь 2014 года

Активы	Код строки	На 31.12.2014 года	На 31.12.2013 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	220 073	27 936
Вложения в долгосрочные активы	140		4 192
ИТОГО по разделу I	**190**	**220 073**	**32 128**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	18 383	13 294
В том числе:			
материалы	211	15 241	10 590
животные на выращивании и откорме	212		
незавершенное производство	213	2 312	1 696
готовая продукция и товары	214	830	1 008
Расходы будущих периодов	230	2 414	1 902
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	35 112	3 530
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	7 377	50 380
Краткосрочные финансовые вложения	260		
Денежные средства и их эквиваленты	270	241	
ИТОГО по разделу II	**290**	**63 527**	**69 106**
БАЛАНС	**300**	**283 600**	**101 234**
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	203 225	1 869
Добавочный капитал	450	14 487	14 487
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	-4 142	-4 275
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470		
Целевое финансирование	480		
ИТОГО по разделу III	**490**	**213 570**	**12 081**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	3 500	
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	47 226	20 576
ИТОГО по разделу IV	**590**	**50 726**	**20 576**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	1 661	2 860
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620		
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	17 643	65 459
В том числе:		14 587	11 122
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631		
по авансам полученным	632	248	108
по налогам и сборам	633	621	1 237
по социальному страхованию и обеспечению	634	293	1 922
по оплате труда	635	800	450
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	1 094	50 620
Резервы предстоящих платежей	660		258
ИТОГО по разделу V	**690**	**19 304**	**68 577**
БАЛАНС	**700**	**283 600**	**101 234**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2014 года

Наименование показателей	Код строки	За январь-декабрь 2014 г.	За январь-декабрь 2013 г.
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	26 293	13 304
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	25 871	14 266
Валовая прибыль (010 – 020)	030	422	-962
Управленческие расходы	040	2 185	3 307
Расходы на реализацию	050	142	
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050)	060	-1 905	-4 269
Прочие доходы по текущей деятельности	070	3 203	4 290
Прочие расходы по текущей деятельности	080	1 441	1 819
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080)	090	-143	-1 798
Доходы по инвестиционной деятельности	100	964	247
В том числе:			
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	964	247
Расходы по инвестиционной деятельности	110	569	63
В том числе:			

Адзін з помнікаў, узведзеных у Любанскім раёне воінам і партызанам, высіцца каля лясной дарогі на востраў Зыслаў.

70 1945 2015 гадоў Вялікай Перамогі

ЗЫСЛАЎ: памяць жыве

Любанскі раён невялікі, перад 1941 годам жыхароў было тут няшмат. Але ваеннае ліхалецце пакінула сляды не меншыя, чым у іншых мясцінах. Незагойнымі застаюцца тыя сляды-шрамы ў лёсах людзей.

Помнікаў змагарам за незалежнасць Радзімы на Любаншчыне шмат. Ад велічнага у цэнтры горада да невялічкіх, схаваных пад шатамі дрэў ўсцяж лясных дарог — усе яны нагадваюць пра воінаў і партызанаў-землякоў. Толькі чаго варты былі б самыя велічныя манументы без памяці, якую пераймае падрастаючае пакаленне ў сваіх папярэднікаў?

Любанскі музей народнай славы. Адна з багатых экспазіцый прысвечана партызанам вострава Зыслаў. Пад шклом выстаўлены асабістыя рэчы, зброя лясных мсціўцаў. Невядома, хто ў часы вайны зрабіў унікальныя фотаздымкі, але на кожным з гэтых кадраў можна доўга разглядаць рысы твараў, дэталі адзення, рыштунак.

— Мы абавязкова звяртаем увагу наведвальнікаў на гістарычныя фота, — кажа **дырэктар музея Наталля СІНЯК.** — Напрыклад, гэты здымак паказвае партызанскую збройную майстэрню. У атрад мсціўцаў уліваліся новыя сілы: мясцовыя жыхары, бежанцы, чырвонаармейцы, якія выходзілі з акружэння. Патрабавалася зброя. Сярод тых, хто забяспечваў узбраенне, быў інжынер Тэнгіз Шаўгулідзэ, які сканструяваў партызанскі гранатамёт. Гэтая ўнікальная зброя прадстаўлена ў экспазіцыі. Дакументы, фотаздымкі, рэчы выдатна перадаюць атмасферу партызанскага жыцця, але мы распрацавалі яшчэ адзін эфектыўны спосаб яскрава расказаць пра гераічнае мінулае. «Пазыўны «Зыслаў» — так мы назвалі інтэрактыўную гульню для школьнікаў. Падзеленыя на групы, дзеці атрымліваюць аператыўныя заданні, якія патрабуюць не толькі ведаў гісторыі, але і спрыту, бо, каб знайсці адказ, неабходна хутка перамяшчацца па экспазіцыі музея і па горадзе.

Дарэчы, такая інтэрактыўная гульня спадабалася і школьнікам з Расіі, якія былі на экскурсіі па партызанскіх сцежках Любаншчыны. Увогуле, гістарычная тэма беларускіх народных мсціўцаў заўжды запатрабаваная не толькі ў выхаваўчым працэсе, але і ў міжнародных культурных праектах, турызме.

Вось яшчэ адзін факт з мінулага, якім цікавяцца не толькі школьнікі, але і педагогі-даследчыкі. У час вайны, нягледзячы на ўсе цяжкасці, у партызанскай вёсцы Загалле працавала непадкантрольная акупантам «зялёная школа». У свабодны ад заняткаў час яе вучні дапамагалі набіраць лістоўкі, клапаціліся аб параненых, працавалі на хлебапякарні, вазілі партызанам сена, шукалі ў лясных гушчарах парашуты з грузамі (іх для атрада скідвалі савецкія самалёты). Школа дзейнічала па ўсіх правілах: заняткі ішлі па савецкіх праграмах, настаўнікі рэгулярна абмяркоўвалі вынікі, праводзілі педсаветы, адзначалі святы — Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі і Новы год. Найбольш поўна пра «зялёную школу» сёння можна даведацца ў Загальскай сельскай бібліятэцы. Землякі сабралі тут багаты матэрыял пра гераічнае мінулае свайго краю.

Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара.
(Працяг тэмы будзе.)

«Так выглядаў гранатамёт, выраблены ў партызанскай збройнай майстэрні», — расказвае наведвальнікам Любанскага музея народнай славы старшы навуковы супрацоўнік Антаніна СІМАНАВА.

Газеты «Чырвоная змена», «Звязда», «Кліч Радзімы», якія выпускала падпольная друкарня.

■ Развітальнае

Я БОЛЬШ НІКОЛІ НЕ ЎБАЧУ МОРА...

З чаго пачынаецца сяброўства?

Колькі людзей, столькі меркаванняў. Нехта скажа — з усмешкі, нехта — са школьнай парты, са студэнцкай бульбы, сумеснай працы, рыбалкі, паездкі... Наша — пачалося з кніжкі Лідзіі Арабей «Пошукі ісціны. Абразкі».

Любімы жанр, любімая аўтарка... Гэтага ж дастаткова, каб забраць з «Акадэмкнігі» ўсе чатыры асобнічкі (для сябе і сяброў), каб за суткі прачытаць (а нешта і перачытаць!), а потым, набраўшыся нахабства, пазваніць?

Якімі словамі я казала вядомай пісьменніцы пра свае ўражанні, цяпер не ў памяці. У памяці, што Лідзія Львоўна спыніла той «маналог» спакойным: «Спадабалася кніжка — ну то і добра. Калі будзе час, зайдзіце. Я вам падпішу».

Зайшла — назаўтра ж. Гадоў з дзевяць таму... Каб потым кожны раз («калі будзе час») прыходзіць зноў і зноў, да апошняга. Сорак дзён таму, 19 лютага, мы з ёй яшчэ размаўлялі, жартавалі... А 20-га...

Пасля страшнай весткі сну не было. І ў той жа час... сон быў. Недзе пад раніцу прысніла, што пераступаю парог да болю знаёмай кватэры, што гаспадыня выходзіць насустрач... Я здзіўляюся: «Як? Вы ж памерлі? І вас няма?!». А яна з усмешкай адказвае: «Вечна гэта Галка (адзіная сваячка, сястра па маці) усё пераблытае. Я — жывая»...

Чытаю, перачытваю яе творы (яны ёсць у бібліятэках і кнігарнях), гартаю кніжкі абразкоў і веру тады, што гэта напраўду так.

Лідзія АРАБЕЙ з любімым мужам мастаком Яўгенам ГАНКІНЫМ і любімым пісьменнікам Васілём БЫКАВЫМ.

ЗАМУЖЖА

Маладыя дзяўчаты хочуць замуж. Тэлебачанне, гламурныя часопісы размалёўваюць шыкоўнае жыццё за багатымі бізнесменамі. І дзяўчаты прагнуць такога гламурнага жыцця — з курортамі ў замежжы, з уласнымі яхтамі і палацамі.

Але багатых бізнесменаў хутка разбіраюць, ды іх не так і шмат, на ўсіх, каго яны так вабяць, яўна не хапае.

Застаюцца пітушчыя, нягеглыя, якія самі шукаюць багатых нявест. Прыходзіцца выходзіць за такіх.

МАКІЯЖ

Мы, дзяўчаты саракавых гадоў мінулага стагоддзя, не ведалі, што такое макіяж, абыходзіліся туалетным мылам ды зубною шчоткаю, а таму выглядалі натуральна. Мы хлопцаў не ашуквалі: падабаюся такая, як ёсць, — бяры замуж, не падабаюся — не бяры.

ВІНШАВАННІ

Напярэдадні дня нараджэння мужа жонка абзвоньвала знаёмых і між іншым гаварыла:

— Не забудзьцеся, што ў Валодзі дваццатага дзень нараджэння. Пазваніце яму і павіншуйце, яму будзе вельмі прыемна.

І людзі званілі, віншавалі, і таму Валодзю сапраўды было вельмі прыемна, што столькі людзей памятаюць пра яго дзень нараджэння і віншуюць.

НАВЕКІ

Яны шмат гадоў пражылі разам, але яна ніколі не была за ім шчаслівай. Быў ён вельмі памаўзлівы, да яе даходзілі чуткі пра яго раманы. Жыла пад вечнаю трывогаю — аднойчы пойдзе і не вернецца.

Ён памёр у даволі маладым веку. А праз нейкі час памерла і яна. Як законную жонку, яе пахавалі побач з ім.

ПЕРАВАГА

Наименование показателей	Код строки	За январь - декабрь 2014 года	За январь - декабрь 2013 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	177 664	137 509
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(147 709)	(119 430)
Валовая прибыль (010 – 020)	030	29 955	18 079
Управленческие расходы	040	(16 065)	(13 277)
Расходы на реализацию	050	(17 322)	(11 638)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050)	060	(3 432)	(6 836)
Прочие доходы по текущей деятельности	070	6 162	7 620
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(9 948)	(11 094)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080)	090	(7 218)	(10 310)
Доходы по инвестиционной деятельности	100	60 033	2 632
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	59 405	2 120
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	628	129
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	-	383
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(37 031)	(3 264)
В том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(37 031)	(3 264)
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	-	-
Доходы по финансовой деятельности	120	199	73
В том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	188	73

Наименование показателей	Код строки	За январь - декабрь 2014 года	За январь - декабрь 2013 года
1	2	3	4
прочие доходы по финансовой деятельности	122	11	-
Расходы по финансовой деятельности	130	(64 712)	(1 431)
В том числе:			
проценты к уплате	131	(2 147)	(1 254)
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(62 565)	(164)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	-	(13)
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100 - 110 + 120 - 130)	140	(41 511)	(1 990)
Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140)	150	(48 729)	(12 300)
Налог на прибыль	160	-	-
Изменение отложенных налоговых активов	170	-	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190		-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	(6)	(5)
Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200)	210	(48 735)	(12 305)
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	-	42 593
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230		
Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230)	240	(48 735)	30 288
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

4.Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %): **0**

Вид собственности	Количество акций, шт.	Доля в уставном фонде, %
республиканская	0	0
коммунальная всего:	0	0
в том числе:	x	x
областная	0	0
районная	0	0
городская	0	0

5-6. Информация о дивидендах и акциях

Показатель	Единица измерения	С начала года	За аналогичный период прошлого года
Количество акционеров, всего	лиц	435	436
в том числе: юридических лиц	лиц	1	1
из них нерезидентов Республики Беларусь	лиц	0	0
в том числе: физических лиц	лиц	434	435
из них нерезидентов Республики Беларусь	лиц	0	0
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	0,00	0,00
Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде	миллионов рублей	0,00	0,00
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	0,00	0,00
Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги)	рублей	0,00	0,00
Обеспеченность акции имуществом общества	тысяч рублей	9,70	17,43
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	штук	0	0

7,8. Отдельные финансовые результаты

Показатель	Единица измерения	С начала года	За аналогичный период прошлого года
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	миллионов рублей	177664,00	137509
Себестоимость реал. продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию	миллионов рублей	181096,00	144345
Прибыль (убыток) до налогообложения, всего	миллионов рублей	-48729,0	-12300,0
в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	миллионов рублей	-3432,0	-6836,0
в том числе: прочие доходы и расходы по текущей деятельности	миллионов рублей	-3786,00	-3474,00
в том числе: прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности	миллионов рублей	-41511,00	-1990
Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	миллионов рублей	6,00	5
Чистая прибыль (убыток)	миллионов рублей	-48735,0	-12305,0
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	миллионов рублей	-136104,00	-87385
Долгосрочная дебиторская задолженность	миллионов рублей		
Долгосрочные обязательства	миллионов рублей	661089,00	142314,00
Среднесписочная численность работающих	человек	301	316

9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета):
Блоки стеновые из ячеистого бетона 93,1% 197902 млн. руб.

12. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год:
27 марта 2015 г.

15. Сведения о применении эмитентом правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета)
Регламент работы с реестром владельцев ценных бумаг утвержден общим собранием акционеров (протокол № 11 от 22.12.09).Положение о порядке учета аффилированных лиц общества и согласования сделок, в совершении которых имеется заинтересованность аффилированных лиц, утверждено общим собранием акционеров (протокол № 1 от 29.03.11).

Руководитель **В. Л. Бохан**
Главный бухгалтер **И. В. Телехан**

ОАО «Красный Октябрь»

Учетный номер плательщика: 300003144
Вид экономической деятельности: производство обуви (19300)
Орган управления: Концерн «Беллегпром»
Единица измерения: млн. руб.
Адрес: 210026, Витебск, пр-т Людникова,10

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2015 года

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2014 года	На 31 декабря 2013 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	25 392	24 371
Нематериальные активы	120	107	-
Доходные вложения в материальные активы	130	-	37
в том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	-	37
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	92	24
Долгосрочные финансовые вложения	150	203	203
Отложенные налоговые активы	160	6	7
Прочие долгосрочные активы	180	1 187	32
ИТОГО по разделу I	**190**	**26 987**	**24 674**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	157 099	117 991
в том числе:			
материалы	211	29 423	32 003
незавершенное производство	213	8 772	5 999
готовая продукция и товары	214	118 904	79 989
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	63
Расходы будущих периодов	230	1 106	548
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	6	26
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	48 033	43 831
Денежные средства и их эквиваленты	270	9 211	4 467
ИТОГО по разделу II	**290**	**215 455**	**166 926**
БАЛАНС	**300**	**242 442**	**191 600**

СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	На 31 декабря 2014 года	На 31 декабря 2013 года
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	198	198
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	240	240
Добавочный капитал	450	75 126	76 586
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	100 988	64 285
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	-	-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**176 552**	**141 309**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	3 410	109
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	8	8
ИТОГО по разделу IV	**590**	**3 418**	**117**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	14 576	8 607
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	14 221	6 231
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	33 564	25 058
в том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	27 367	20 957
по авансам полученным	632	2 999	529
по налогам и сборам	633	636	1 106
по социальному страхованию и обеспечению	634	488	498
по оплате труда	635	1 616	1 882
прочим кредиторам	638	458	86
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	111	10 278
ИТОГО по разделу V	**690**	**62 472**	**50 174**
БАЛАНС	**700**	**242 442**	**191 600**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2014 года

Наименование показателей	Код строки	За январь–декабрь 2014 года	За январь–декабрь 2013 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	257 586	246 360
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(190 103)	(174 831)
Валовая прибыль (010-020)	030	67 483	71 529
Управленческие расходы	040	(17 982)	(14 818)
Расходы на реализацию	050	(6 411)	(4 291)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)	060	43 090	52 420
Прочие доходы по текущей деятельности	070	56 593	69 931
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(58 096)	(71 508)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080)	090	41 587	50 843
Доходы по инвестиционной деятельности	100	977	1 661
в том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	515	1 204
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	24	4
проценты к получению	103	412	420
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	26	33
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(454)	(1 138)
в том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(453)	(1 138)
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	(1)	-
Доходы по финансовой деятельности	120	12 762	3 812
в том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	12 762	3 812
прочие доходы по финансовой деятельности	122	-	-
Расходы по финансовой деятельности	130	(17 572)	(8 267)
в том числе:			
проценты к уплате	131	(1 719)	(1 459)
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(15 853)	(6 424)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	-	(384)
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130)	140	(4 287)	(3 932)
Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140)	150	37 300	46 911
Налог на прибыль	160	-	(7 770)
Изменение отложенных налоговых активов	170	-	5
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	(62)	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-	(40)
Чистая прибыль (убыток) (±150-160±170±180-190-200)	210	37 238	39 106
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	-	3 708
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230)	240	37 238	42 814
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

Руководитель Сарбай Г.Г.
Главный бухгалтер Сахарова Н.П.

Информация о дивидендах и акциях

Показатель	Единица измерения	С начала года	За аналогичный период прошлого года
Количество акционеров, всего	лиц	5153	5154
в том числе: юридических лиц	лиц	1	1
из них нерезидентов Республики Беларусь		-	-
в том числе: физических лиц		5152	5153
из них нерезидентов Республики Беларусь		8	8
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	-	-
Фактически выплаченные дивиденды, в данном отчетном периоде	рублей	-	-
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	-	-
Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги)	рублей	-	-
Обеспеченность

Ігуменскі тракт

№ 12 (113)

ДРАЎЛЯНЫЯ ЯРУСЫ МСЦІСЛАВА,

або Горад «пастарэў» на пару дзесяцігоддзяў

Мсціслаў упершыню згадваецца ў Іпацьеўскім летапісе ў 1156 годзе як крэпасць на заходняй мяжы Смаленскага княства. Але датай заснавання лічыцца 1135 год, калі смаленскі князь Мсціслаў Расціслававіч паставіў тут замак і назваў месца ў імя бацькі Мсціслава Вялікага — апошняга князя Кіеўскай Русі. Сёлета горад адзначае сваё 980-годдзе. І раптам напярэдадні святкавання высвятляецца, што «імянінніку» ўжо не менш за 1017 гадоў! Іншымі словамі, праз тры гады можна будзе адзначаць яшчэ адзін юбілей. Калі, вядома, вучоныя зноў не ўдакладняць дату.

ПАДЗЯМЕЛЛІ

Тое, што горад старэйшы як мінімум на некалькі дзесяцігоддзяў, высветлілася падчас экспертызы, якую правялі спецыялісты Міністэрства лясной гаспадаркі. Для аналізу ім былі дадзены фрагменты старадаўняй драўлянай маставой, якую летась падчас раскопак на Замкавай гары знайшлі ўдзельнікі археалагічнай экспедыцыі МДУ імя Куляшова пад кіраўніцтвам **доктара гістарычных навук, прафесара Ігара МАРЗАЛЮКА.**

— Мсціслаў, як і Ноўгарад, мае шмат драўляных ярусаў, — тлумачыць вучоны. — Мы зрабілі раскоп уздоўж меркаванага вала і на глыбіні 1,8 метра наткнуліся на частку драўлянай маставой і рэшткі старажытных пабудоў. Метр за метрам разбіралі гэты горад і з кожнага насыпу бралі фрагменты. Як паказала дэндрахраналагічная экспертыза, дуб, з якога ўзводзіліся зрубы-клеці гарадскіх дамоў, быў ссечаны ў 1098 годзе!

Але гэта не значыць, што гэтае месца пуставала раней. Пад старажытнай маставой яшчэ 2 метры магутнага культурнага слою, які адносіцца да протагарадскога перыяду. Тут даследчыкамі знойдзены рэдкія ключы X стагоддзя, рэшткі ляпной керамікі, зробленай проста рукамі. Па гэтых знаходках можна лічыць, што жыццё тут існавала без перапынку з VIII па X стагоддзе.

ПАДАРОЖЖА НА НЕКАЛЬКІ СТАГОДДЗЯЎ НАЗАД

«Звязда» ўжо пісала пра тое, што летась магілёўскія археолагі зрабілі шмат сенсацыйных знаходак у Мсціславе. Адных толькі ўнікальных прадметаў тут адшукана 725, а масавых і наогул звыш 1000. Сярод рэдкіх рэчаў — лыжка для прычасця, берасцяная грамата са скандынаўскімі рунамі, праселка з пазначаным на ім імем дзяўчыны (нашы продкі яшчэ тысячу гадоў таму былі адукаванымі людзьмі!), фрагменты арабскіх келіхаў, бранзалеты з Сірыі і Візантыі і шмат чаго іншага, не менш каштоўнага. Мяркуецца, што непадалёк ад месца раскопак знаходзілася майстэрня ювеліра. Аб гэтым сведчаць знойдзеныя тут формы і малаточак. А яшчэ сабрана вялікая калекцыя зброі. «Мсціслаў неаднаразова падвяргаўся нападам, — адзначае Ігар Марзалюк. — Добра захаваліся сляды двух магутных пажараў. Адзін з іх датуецца XIV стагоддзем, калі крэпасць штурмавала дружына князя Альгерда. А другі — XVII стагоддзем, калі горад быў знішчаны падчас руска-польскай вайны».

Хутка на Замкавай гары старажытнага горада працягнуцца раскопкі. «Матэрыялы і рэактывы ўжо гатовыя да работы, — гарыць жаданнем як мага хутчэй заняцца справай вучоны. — Будзем рабіць раскоп побач з тым, што ўжо існуе. Летась мы зачапілі гаспадарчыя падворкі і цяпер збіраемся знайсці сядзібу цалкам».

Ігар Марзалюк спадзяецца, што да 980-гадовага юбілею Мсціслава, падчас якога ладзіцца традыцыйны рыцарскі фэст, атрымаецца зрабіць гораду неацэнны падарунак — нешта накшталт вядомага археалагічнага музея ў Брэсце. Гэта будзе стацыянарная драўляная пабудова, унутры якой на плошчы каля 120 квадратных метраў размесціцца кавалачак старажытнага гарадзішча XII стагоддзя з рэшткамі пабудоў рознага прызначэння і часткай драўлянай маставой. Закансерваваць усё гэта на дзесяцігоддзі дапамогуць вопытныя рэстаўратары з Мінска і Гродна, якія прымуць удзел у раскопках.

Вакол старажытнага пасада разгорнецца экспазіцыя, прысвечаная жыццёваму ўкладу ўсходніх славян, на якой будуць прадстаўлены знойдзеныя падчас раскопак археалагічныя знаходкі.

СКАРБ НА ДНЕ ВІХРЫ

Акрамя археалагічных даследаванняў на Замкавай гары, вучоныя збіраюцца пры дапамозе дайвераў з клуба «Марскі Пегас» працягнуць «падводныя раскопкі» на рэчцы Віхра. Леташняй сенсацыяй стала знаходка тут астанкаў рыцара Вялікага Княства Літоўскага ў поўным баявым рыштунку. Даспехі, у якія ён быў апрануты, лічацца рарытэтнымі. Такімі знаходкамі раней маглі пахваліцца толькі Нью-Ёрк і Вена, а цяпер яшчэ і Магілёў. А рыцарскі шлем, які датуецца XV стагоддзем, і наогул адзіны ў свеце. «Ён быў зроблены ў Бургундыі, — лічыць вучоны. — Такі шлем сёння можна пабачыць толькі на малюнках і ў нас. Ён адносіцца да той эпохі, якая апісваецца ў рамане Вальтэра Скота «Квенцін Дорвард». Я нават падазраю, што яго прывёз сын мсціслаўскага князя Сямёна Лугвена Юрый Сямёнавіч у 1448 годзе, калі падарожнічаў са сваёй дружынай па землях Германіі і, магчыма, Бургундыі.

Ігар Марзалюк упэўнены, што Віхра яшчэ хавае ў сабе шмат чаго каштоўнага. І наколькі гэтыя спадзяванні спраўдзяцца, мы даведаемся ўжо ў хуткім часе.

ТУРЫСТАЎ ЗАПРОСЯЦЬ ПРЫНЯЦЬ УДЗЕЛ У РАСКОПКАХ

Дарэчы, планы ў магілёўскіх археолагаў на сёлета вялікія. І яны не абмяжоўваюцца толькі Мсціславам. Старадаўні Прапошаск, а цяпер Слаўгарад, таксама мае шмат цікавых загадак.

У раскопках на тэрыторыі раёна сёлета змогуць прыняць удзел нават турысты. «Мы распрацавалі археалагічны маршрут, які абяцае шмат розных сюрпрызаў, — адзначае Ігар Марзалюк. — Адным з іх стане рэканструкцыя старадаўняга абраду пахавання па ўзоры крэмацыі. Слаўгарадскі раён наогул для археолагаў сапраўдная скарбніца. Тут шмат археалагічных і гістарычных помнікаў, якія яшчэ трэба даследаваць. Нельга не парадавацца і таму, што тут адраджаюцца старадаўнія традыцыі, ладзіцца Сырны фэст. Стварэнне сыру — гэта таксама сімвалічная з'ява ў этнаграфічным сэнсе. Разнапланавымі акцыямі мы збіраемся звярнуць увагу на ўнікальнасць усходне-славянскай культуры і паказаць шырокай грамадскасці, што ў нас таксама ёсць чым ганарыцца.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Памяркоўнасць — гэта мудрасць і сталасць нацыі.

А ЗАМКІ — ЯЕ СІЛА І СЛАВА

Адна з самых значных прац выдавецтва «Бяловагруп», — гэта кніга «Беларусь замкавая», якая сёлета атрымала гран-пры на нацыянальным конкурсе «Мастацтва кнігі». Карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з кіраўніком праектаў гэтай установы Таццянай БЯЛОВАЙ, каб даведацца сакрэт стварэння кнігі, вартай гран-пры, а таксама распытаць пра яе ўнутраныя творчыя арыенціры.

— Ці чакалі вы, што «Беларусь замкавая» будзе ацэнена так высока і атрымае найвышэйшую ўзнагароду?

— Гэта адзнака вялікай шматгадовай працы 18 аўтараў, я вельмі рада за нас усіх (над самой кнігай працавалі 1,5 года). Удзельнічала 20 фотамастакоў — як сталічных, так і з глыбінкі. Яны здзяйснялі экспедыцыі ў пошуках колішніх замкаў, часам ішлі па карце, каб зрабіць усяго некалькі здымкаў і зафіксаваць для гісторыі месцы былой сілы і славы. Налётвалі дзясяткі гадзін на самалёце ці верталёце, каб з птушынага палёту пабачыць родную спадчыну. Даводзілася ў прамым сэнсе сачыць за Млечным шляхам на зорным небе Айчыны, каб паказаць таемнасць замкаў і іх належнасць вечнасці (руіны некаторых аб'ектаў фатаграфавалі на фоне зорнага неба, толькі ў яснае надвор'е).

За пяць стагоддзяў адбылося больш за 100 войнаў! Якую ж цвёрдасць духу, мужнасць сэрца і высакароднасць трэба мець, каб не саступіць з гэтай зямлі...

— Каманда, што працавала над выданнем, атрымалася больш чым сур'ёзнай...

— Вялікую працу зрабіла наша складальніца Вольга Бажэнава, якая разам з выдавецтвам працавала над ідэяй. Важна тое, што нашымі рэцэнзентамі выступілі навукоўцы з Акадэміі навук — акадэмік Аляксандр Лакотка, вучоны акадэмік-сакратар Аляксандр Каваленя, дырэктар Інстытута гісторыі Вячаслаў Даніловіч — гэта значыць, выданне зрабіла сур'ёзны крок наперад у вывучэнні замкаў. Дарэчы, у 1977 годзе гісторыкам Міхасём Ткачовым быў складзены спіс помнікаў абарончага дойлідства IX — XVIII стагоддзя, які налічваў 130 аб'ектаў. Мы пашырылі яго да 300(!) і апублікавалі ў канцы кнігі — вельмі пашчыраваў тут Расціслаў Баравы. Многія з унесеных у спіс помнікаў раней былі малавядомымі, яны знойдзены намі на старых картах, у летапісах. Таму гэта добрая падстава для таго, каб даследаваць, ладзіць экспедыцыі. Дапамагалі таксама навукоўцы Андрэй Мяцельскі, Дзмітрый Дук, Ірына Ганецкая, Ігар Марзалюк і іншыя. Сярод фатографаў асабліва хачу адзначыць Віктара Малышчыца, Анатоля Дрыбаса, Аляксандра Ласмінскага. Важна дадаць, што ў падрыхтоўцы праекта прынялі ўдзел 25 рэдакцый рэённых газет, якія дапамагалі збіраць інфармацыю пра замкі сваёй мясцовасці. Вядома, над выданнем працаваў невялікі, але творчы калектыў «Бяловагруп», у якім, сярод іншых, Кацярына Аксёнава і Кацярына Чарапок. Дарэчы, спонсарам прэзентацыі нашага выдання выступіла кандытарская фабрыка «Чырвоны харчавік», якая вырабляе зефір, мармелад, іншыя салодкасці. Мы вельмі ўдзячны яго кіраўнікам, бо прыкладаў, калі такія прадпрыемствы падтрымліваюць сацыяльныя праекты, зусім мала.

— Усе замкі, згодна з іх захаванасцю, у вашай кнізе размеркаваныя ў «залаты», «сярэбраны» і «крынічны» замкавыя паясы. Раскажыце крыху пра гэтую класіфікацыю і найбольш вядомыя аб'екты кожнай катэгорыі.

— Класіфікацыя ўмоўна-паэтычная. Калі мы нанеслі на карту Беларусі замкі спачатку высокай рэпрэзентатыўнай захаванасці і злучылі іх паміж сабой прамой, атрымаўся цікавы турыстычны маршрут з 11 гісторыка-культурных помнікаў: ад Камянецкай вежы, Ружанскага палаца, гродзенскіх замкаў і далей — Гайцюнішкі, Лідскі замак, Мураванка, Сынкавічы, Любча, сусветна прызнаныя Мірскі і Нясвіжскі замкі, Камайскі касцёл. Атрымаўся «Залаты пояс»! А далей, па задыякальнай карце Беларусі склаўся «Сярэбраны пояс» з 8-мі руін-замкаў: Заслаўскага, Навагрудскага, Геранёнскага, Гальшанскага, Крэўскага, Белага Ковеля, Быхаўскага, Тураўскага. Трэці, самы шчымлівы — гэта «Крынічны пояс». Колішнія цвярдыні засталіся ў зменены рэльефе зямлі: абарончыя рвы, валы, якія дамалёўваюць агульную карціну Беларусі замкавай.

— У выданне ўвайшлі ўнікальныя фотаздымкі, картаграфічны матэрыял, гістарычныя малюнкі і гравюры. Якім чынам збіралі архіўныя матэрыялы?

— Аўтары дзень за днём адшуквалі яго ў самых розных крыніцах. Больш за тое, па-за выданнем яшчэ застаўся багаты картаграфічны, архіўны, гістарычны матэрыял. Ідэю горача падтрымалі літоўскія навукоўцы, яны з асаблівай сімпатыяй ставяцца да Беларусі, але пажадалі застацца невядомымі.

— У кнізе апублікавана хроніка замкаў. Што яна сабой уяўляе?

— Хронікі — кароткія звесткі гісторыі замкаў Беларусі. Сабраныя з самых розных крыніц — ваенных і палітычных летапісаў, мастацкіх і літаратурных твораў, іканаграфіі — яны прыведзены ў храналагічным парадку. У хроніках вычарпальная сучасная інфармацыя пра замкі падаецца ў сціслай, лагічнай паслядоўнасці.

— Як увогуле з'явілася ідэя выдання?

— Гады тры таму ў Вільнюсе на кніжнай выставе мне трапілася кніга, дзе нашы беларускія замкі выглядалі, нібыта пасынкі, мякка кажучы. Захацелася годна адказаць. А падчас працы захапіла... Аснову кнігі складаюць аб'екты, што ўвайшлі ў дзяржаўную праграму «Замкі Беларусі». Гэта праект дзеля душы. Мы так зроблены, што ўвесь час шукаем сэнс свайго існавання — можа быць, гэтай кнігай я наблізілася да яго...

— Аднойчы вы сказалі: «Каб разумець характар беларусаў і не з гумарам, а цёпла ставіцца да нашай памяркоўнасці, трэба ведаць гісторыю...» Размовы пра гэтую рысу нашага народа вядуцца пастаянна, часцей ёй даецца негатыўная ацэнка. А што вы скажаце наконт такой якасці беларусаў?

— Памяркоўнасць сапраўды глыбока нацыянальная рыса беларусаў. Яна, відаць, у нашых генах, ідзе ад нашай гісторыі. За пяць стагоддзяў адбылося больш за 100 войнаў(!) — мы падлічылі гэта падчас працы над кнігай, але не апублікавалі: падумалі, а раптам памыліліся — не наклікаць бяду... З чатырох стагоддзяў, з XV па XVIII, два вырвала вайна! Удумайцеся толькі. У XVII ажно 71 год апалены вайной! Якую ж цвёрдасць духу, мужнасць сэрца і высакароднасць трэба мець, як любіць сваю радзіму, каб не саступіць з гэтай зямлі, каб даваць працяг новаму жыццю. Сівая грозная даўніна — наш настаўнік. Памяркоўнасць беларусаў я вызначаю як мудрасць і сталасць нацыі. Дарэчы, мінскія дамоўленасці — тое, што мы аказаліся ў фокусе сучаснай сусветнай гісторыі, — думаю, стала магчымым менавіта дзякуючы нашай памяркоўнасці, вытрымanасці дзяржаўнай палітыкі.

— Уладзімір Караткевіч напісаў такія словы: «Карані маўчаць, разрастаюцца ў зямлі і чакаюць свайго дня». Як вы лічыце, ці хутка настане час, калі ўсё тое, што назапашана ў нашых каранях, нарэшце зазелянее і зацвіце?..

— Сам Караткевіч, яго творы — дрэва ці не ад самых гэтых каранёў? Чым не з'ява — прыход у свет пісьменніка такой велічыні? І тое, што абуджаецца наша гістарычная памяць, адбываюцца значныя зрухі, — гэта відавочна. Карані агульнай нацыянальнай памяці сілкуюць нас. Трэба толькі звярнуцца да іх у сваім асабістым жыцці.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.



На прэзентацыі «Беларусі замкавай» у Нацыянальнай бібліятэцы міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ адзначыла:

Гэта кніга — вялікая праца і поспех не толькі творчага калектыву — выдавецтва «Бяловагруп» і паліграфкамбіната імя Якуба Коласа, — але і поспех усёй краіны. Сёння мы бачым, як аднаўляюцца замкі, як для кожнага з нас, старонка за старонкай, узнаўляецца наша гісторыя. Нельга без хвалявання ўспрымаць тое, што наша мінулае багатае на замкі, — але яны як узнікалі, так і руйнаваліся. Бо на асобныя стагоддзі прыпадала больш гадоў вайны, чым міру... Беларусь заўсёды была ў цэнтры еўрапейскай часткі зямлі і прываблівала іншых, якія пастаянна імкнуліся прыйсці сюды, і не толькі ў мірных мэтах. Таму вельмі хораша, што ў гэту вясну, у вясну 70-годдзя Вялікай Перамогі, у нас цудоўнае сонца, выдатны настрой і такі добры праект. Я хачу пахваліцца яшчэ і нашым нацыянальным кнігавыданнем, бо «Беларусь замкавая» адбылася яшчэ і дзякуючы таму, што дзяржава сёння актыўна падтрымлівае сацыяльна значныя праекты, якія прапануюць выдаўцы. Выдавецкае поле краіны — гэта звыш 400 выдаўцоў. У многіх з іх ствараюцца цікавыя праекты, але гэты, які мы прэзентуем сёння, з'яўляецца асаблівым унёскам у нацыянальную культуру.

■ Па Беларусі з Напалеонам Ордам

ПАЛАЦ ЮСТЫНІЯНА ШЧЫТА

Сучаснікі высока ацэньвалі працу мастака Напалеона Орды. «Цудоўнае адлюстраванне культуры і інтэлектуальнага жыцця на землях старажытнай Рэчы Паспалітай, якое красамоўна сведчыць перад сусветам аб векавых традыцыях і высокім узроўні развіцця навукі і мастацтва», — пісаў у 1878 годзе часопіс «Tygodnik Ilustrowany». А як жа павінны быць удзячны вандроўнаму мастаку мы сёння, калі большасці аб'ектаў, што трапілі ў поле яго зроку, проста не існуе!

Аднак ці шмат мы ведаем пра тыя сядзібы, храмы ці віды гарадоў, што сталі галоўнымі дзеючымі персанажамі малюнкаў Орды? Са шкадаваннем даводзіцца прызнаць, што не. А між тым кожны з іх мае ўласную гісторыю і сваё месца ў гістарычнай спадчыне Беларусі і Польшчы. Пра адзін з іх я і хачу расказаць.

«24 чэрвеня. Юстыніянаў. Шчыт Юстыніян», — так Напалеон Орда падпісаў адну са сваіх акварэляў, зробленую ў 1876 годзе ў ваколіцах Дрысы (сучасны Верхнядзвінск Віцебскай вобласці). На ёй мы бачым раку Заходнюю Дзвіну, па якой плыве лодка з узнятымі ветразямі, на адным беразе ў глыбіні парку двухпавярховы мураваны палац, на другім — купалы невялікай царквы.

Сёння якраз у гэтым месцы праходзіць мяжа двух раёнаў. На тым беразе, дзе знаходзілася царква (яна захавалася да нашага часу), цяпер вёска Узмёны Мёрскага раёна, на супрацьлеглым — вёска Юстыянава, якая знаходзіцца на тэрыторыі раёна Верхнядзвінскага. Як бачыце, змяніўся нават сам тапонім — з назвы «Юстыніянава» выпала частка «ні». Ад палаца і навакольных пабудоў не засталося нават каменя.

Твор італьянца Спампані

Палац у Юстыніянаве з'яўляўся ўласнасцю пасла на соймы і скарбавага пісара Вялікага Княства Літоўскага Юстыніяна Шчыта герба «Ястрабец». «Дом майго бацькі быў не толькі шматлюдны, але нават і спосаб жыцця меў цудоўны, — пісаў у сваіх успамінах яго сын Юзаф Шчыт. — Смела магу сказаць, што не было тады ў той старонцы лепшага дома, чым дом майго бацькі, пасля шасцігадовага яго жыцця ў Варшаве, дзе ён засядаў у радзе, аб чым паведаміў у апісанні свайго жыцця. Ён спалучаў старадаўнюю сціпласць са звычаямі новага часу, элегантнасцю жыцця, прыхільнасцю да літаратуры і добрымі манерамі, наведваўся самымі шаноўнымі асобамі і заўсёды быў напоўнены гасцямі. Колькасць дамовых асоб даходзіла да двухсот».

Кантракт на ўзвядзенне ў Юстыніянаве палаца з належнымі афіцынамі, а таксама распланаванне парку Юстыніян Шчыт заключыў 28 верасня 1779 года з «капітанам літоўскага войска і архітэктарам» Карлам Спампані. Італьянец шмат будаваў на Беларусі і ў Літве, працуючы на Радзівілаў, Храптовічаў і іншых магнатаў, выконваў заказы каталіцкага касцёла.

Нядоўгі век славутага архітэктара і шырокі маштаб будаўніцтва расцягнулі ўзвядзенне палаца на некалькі дзесяцігоддзяў. Аднак калі яно было скончана, жыццё тут забуяла. Бог абдарыў Юстыніяна Шчыта шматлікімі нашчадкамі. Ад двух шлюбаў ён меў у агульнай колькасці дзевяць дзяцей.

«Каштalянская карэта»

Прадметам асаблівага клопату любога магнацкага ўладання былі стайня, псярня і арсенал. «Коней, апроч тых, што належалі гасцям, было да васьмідзесяці, — пісаў Юзаф Шчыт. — Псярня складалася з выжлаў — 6, хартоў — 8 і ганчакоў 15 зграяў. Карэт было 4, з якіх адна была абабіта яркa-чырвоным аксамітам, пераплеценым збоку золатам, з пазалочанымі слупкамі і ручкамі, блакітнага лаку, якую звалі кашталянскай. Былі таксама дзве зімовыя карэты, вельмі шмат парадных саней. Пад наглядам пана Ярмарковіча знаходзіліся разнастайныя давераныя яму рэчы: карабелі (парадныя шаблі) і розная зброя. Быў таксама асобны склад рыштунку, дзе знаходзілася 200 карабінаў, 100 пісталетаў, 100 шабель і 100 сёдлаў былых прыдворных жаўнераў, якіх утрымліваў мой дзед, кашталян інфлянцкі».

Амаль кожны дзень пасля абеду мужчыны звычайна ездзілі конна па дзядзінцы пад надзорам стайніка, а па вечарах, асабліва ў святочныя дні, іграла музыка, панны спявалі розныя песні.

Блакітная дэлія на рысіным футры

Юстыніян Шчыт быў тыповым узорам сармата, тыпаж якога імкліва адыходзіў у мінулае. Вольналюбівы дух, пачуццё годнасці і любоў да Айчыны займалі цэнтральнае месца ў касмасе яго светапогляду. Сармат быў чалавекам рэлігійным і дабрачынным, у служэнні Айчыне зброяй, розумам ці адукацыяй знаходзіў найвышэйшае задавальненне. Шанаваў жанчыну — маці, жонку, сястру, каханую. Меў багаты дом, але не дазваляў сабе ў ім празмернай раскошы і эпікурэйства. Сурова выхоўваў нашчадкаў па мячы, імкнучыся перадаць ім у спадчыну не толькі зямное багацце, але і добрае імя. Бавіў час у бяседзе і на паляванні, лепшым танцам лічыў паланэз. Быў адкрыты свету, і хоць не надта разумеў у жывапісе і прыгожых мастацтвах, але заўсёды меў у сябе галерэю партрэтаў продкаў і імкнуўся даць дзецям самую лепшую адукацыю.

Сваёй неадменнай прыкметай сармат лічыў старадаўні строй — жупан (даўгаполая вопратка з сукна ці шаўковых тканін, пашыраная ўніз ад лініі таліі), кунтуш (адзенне з прарэзанымі рукавамі), пояс і шаблю. Пра гардэроб Юстыніяна Шчыта можна атрымаць ўяўленне на падставе рэестра рэчаў, якія былі выдадзены яго лёкаю Мікалаю на захаванне пры ад'ездзе пана па справах у Варшаву ў 1771 годзе.

Пералік уключаў 54 адзінкі мужчынскага ўбрання, у які ўваходзіла толькі верхняе адзенне. Шчыт, не маючы вялікага замілавання да строяў, узяў з сабой, тым не менш, 17 жупаноў і 12 кунтушоў розных тканін і колераў. Пару жупан-кунтуш звычайна падбіралі па кантрасных колераў, якія пасавалі адзін да аднаго і рабілі асабліва маляўнічым выгляд іх уладальніка.

Жупан або кунтуш — парадnае адзенне —

Звычайна апранаецца на пасяджэнне

Суда, а не ў дарогу...

— пісаў у «Пане Тадэвушы» Адам Міцкевіч.

Для аздобы прызначаліся яшчэ 8 паясоў (сярод іх адзін «слуцкі са срэбрам») і 4 шапкі. Асобным упрыгожаннем мужчынскага касцюма была дэлія — вопратка, падбітая дарагім футрам, якая іншым разам упрыгожвалася ювелірна выкананымі гузікамі. Пан Юстыніян меў цэлых дзве дэліі — блакітную, падшытую футрам рысі, і пунсовую, падбітую чорнымі баранчыкамі.

Юстыніян Шчыт памёр 7 сакавіка 1824 года ў сваім наддзвінскім палацы. Цела адвезлі ў недалёкія Валынцы і пахавалі ў сутарэннях касцёла ксяндзоў-дамініканцаў.

Людміла ХМЯЛЬНІЦКАЯ

БАЙКІ кухмістра ВЕРАШЧАКІ

ВЕЛІКОДНЫЯ БАБКІ

Адна з даўніх баек гэтай рубрыкі (ад 17 снежня 2013 года) пераказвала легенду, а хутчэй, анекдот XIX стагоддзя, ад навагрудскага адваката Ігнацыя Яцкоўскага — адкуль узяліся велікодныя бабкі ў Літве (і на Беларусі, вядома). Але адкуль жа насамрэч паходзіць назва «баба» («бабка»)? На гэты конт ёсць некалькі версій.



«Няўдалыя бабы», малюнак Ю. Рышкевіча.

Паводле адной з іх, назву прыдумаў былы кароль польскі і вялікі князь літоўскі Станіслаў Ляшчынскі, калі ён пасля 1738 года жыў на выгнанні ў Францыі як князь Латарынгскі. Яму надакучыла мясцовая выпечка kugelhupf, занадта сухая, і ён аднойчы, раззлаваны адсунуўшы талерку з імі, штурхнуў бутэльку з ромам, які разліўся і насыціў сухія «кугелі» (як варыянт — мяшанкай з рому і салодкай малагі пачаў прамочваць «кугелі» яго кандытар Шторэр). Тое, што атрымалася, спадабалася выгнаніку значна больш. А паколькі ён захапляўся казкамі «Тысячы і адной ночы», дык назваў новы кандытарскі выраб з ромам у гонар Алі Бабы — Baba au rhum. Так з'явіліся ромавыя бабы і, быццам бы, бабы ўвогуле. Польскі энцыклапедыст Зыгмунт Глогер лічыў, што дражджавыя бабы, якія выпякаліся на Вялікдзень і на Тройцу, некалі называліся «бабіны калачы», а пазней назву скарацілі да проста «бабы». А сучасны польскі філолаг Мацей Маліноўскі лічыць, што форма ўсечанага конуса, якую часцей за ўсё маюць бабы, нагадвала жаночыя спадніцы.

Самай галоўнай нагодай для выпечкі баб быў Вялікдзень, дакладней, святочнае снеданне ў велікодны панядзелак («свянцонае», або «свячонае»). Да гэтага дня бабы пякліся ў кожным шляхецкім двары, часцей за ўсё не па адной, і гэты працэс быў сапраўдным выпрабаваннем для гаспадыні. Дарагія прыправы (асабліва шафран), найлепшыя дрожджы, самая белая мука, вялізныя разынкі, молатыя мігдалы, неймаверная колькасць яечных жаўткоў — можна сказаць, што кожная баба была сур'ёзнай «інвестыцыяй», асабліва ўлічваючы, што некаторыя з іх дасягалі вышыні амаль паўметра! Таму рызыка, што баба не атрымаецца, цеста або ападзе, або, наадварот, занадта «выпра» з формы, была сапраўдным галаўным болем для гаспадынь і іх кухарак. Ігнацы Яцкоўскі іранічна пісаў пра гэта: «У Літве паненцы можна памыліцца ў такце музыкі альбо танца, але нельга памыліцца ў выкананні рэцэптаў бабак і вяндлiны. А рэцэпты не такія лёгкія, як гэта здаецца, бо найменшая драбяза, зробленая не так, псуе ўсё. А калі каторая з нашых чытачак гэтаму не верыць, дык няхай у Літве зробіць бабку паводле рэцэптаў парыжскіх альбо лонданскіх пекараў, то заробіць сабе бессмяротнасць у прыказцы, як заслужыў яе сабе Заблоцкі ці пані Каўнацкая».

Залітае ў формы і прыкрытае льняным палатном цеста на бабкі, пакуль падыходзіла, трымалі ў замкнёным пакоі, у які не дапускаліся ані дзеці, ані мужчыны, і нават паблізу забаранялася гучна размаўляць, бегаць. Няўдалая баба была сапраўднай ганьбай для гаспадыні — гэты сюжэт часта сустракаецца ў гумарыстычных малюнках XIX стагоддзя. Бабы, вынутыя з печы, з амаль рэлігійным трапятаннем выкладалі на пуховыя пярыны, каб астылі. А металічныя або керамічныя формы для выпечкі часта аздабляліся патрыятычнымі матывамі, напрыклад, гербамі гістарычных краін Рэчы Паспалітай.

Велікоднае печыва дзеліцца на тры асноўныя віды: бабкі, мазуркі і торты, а апошнія зноў маюць столькі відаў, колькі пяску ў моры. Мужчыны не ведаюць гэтых тонкасцяў, і толькі вострыя жаночы розум можа іх ахапіць і ацаніць належным чынам. Бабкі бываюць шафранавыя, ванільныя, хлебныя і петынетавыя. Гэтыя апошнія патрабуюць неймавернай колькасці жаўткоў, а калі яны падыходзяць, нельга набліжацца да печы нікому, і асабліва мужчынам, якія па натуры нязграбныя і цяжка ступаюць... Ганаровая варта забяспечвае недатыкальнасць іх каралеўскіх вялікасцяў бабаў і мазурак... Мазуркі і праснакі, белыя і жоўтыя, карычневыя і вясёлкавыя, ляжаць усюды пакрыху, а на чатырох рагах — цудоўныя бабы, тоўстыя, як пухіры, расселіся ганарліва і сцерагуць стол, нібы чатыры вежы абарончай крэпасці. (Ян Булгак. Край дзіцячых гадоў.)

БАБЫ ВЯРШКОВЫЯ (З «КУХАРКІ ЛІТОЎСКАЙ»)

Складнікі: *6 шклянак мукі, 6 шклянак жаўткоў, 1,5 шклянкі вяршкоў нагрэтых, але не гатаваных, 2,5 шклянкі цукру, 1,5 шклянкі масла пакаёвай тэмпературы, 120 г дражджэй, трохі солі.*

Спосаб прыгатавання: Вымешаўшы, паставіць, каб цеста добра падышло. Калі падыдзе, добра замясіць і наліць дзве формы да палавіны. Калі цеста запоўніць формы цалкам, асцярожна паставіць у печ. З такой колькасці прадуктаў атрымліваюцца дзве сярэднія бабы; падыходзяць доўга.

■ Факт

НАПІШЫ ЛІСТ ВЕТЭРАНУ!

Усебеларуская патрыятычная акцыя «Ліст Пераможцу!» стартавала ў Беларусі.

Гэта сумесны праект БРСМ, Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі і ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне» прысвечаны 70-й гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. БРСМ і БРПА запрашаюць школьнікаў, студэнтаў, працоўную моладзь і ваеннаслужачых тэрміновай службы напісаць ліст-трохкутнік, каб падзякаваць удзельнікам і ветэранам Вялікай Айчыннай вайны за мірнае неба над галавой, за магчымасць жыць у вольнай і незалежнай краіне. Менавіта такія лісты паперы, складзеныя ў трохвугольнікі, звязвалі франтавікоў з іх роднымі. Спецыяльны бланк для «ліста на фронт» з лагатыпам акцыі «Кветкі Вялікай Перамогі» — чырвона-зялёнай стужкай і яблыневай кветкай — можна спампаваць на інтэрнэт-партале «Моладзь Беларусі» www.brsm.by.

Напісаўшы ліст, трэба скласці незвычайны допіс у ліст-трохкутнік і да 17 красавіка перадаць яго сакратару пярвічнай арганізацыі БРСМ ці старшыні піянерскай дружыны БРПА па месцы вучобы, працы ці службы. На зваротным баку трохвугольніка абавязкова павінна змяшчацца інфармацыя пра аўтара. Вынікі акцыі арганізатары плануюць падвесці да 30 красавіка.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ДЗЕ МОЖНА ЛАВІЦЬ ВУГРА?

У краіне вызначаны месцы і ўмовы прамысловага вылаву вугра без захавання прамысловай меры (мінімальна дапушчальная да вылаву мера на рыбу) у рыбалоўных угоддзях у 2015 годзе.

Пра гэта гаворыцца ў адпаведнай пастанове Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, якая апублікавана на Нацыянальным прававым партале і ўжо ўступіла ў сілу. Дакументам зацверджаны пералік рэк і азёр, дзе юрыдычным асобам у перыяд веснавога нерасту рыбы дазволены вылаў вугра. Такія пастановы прымаюцца штогод.

Прыняцце рашэння абумоўлена ўнікальнасцю біялогіі вугра. Ён размнажаецца толькі ў Саргасавым моры і ў перыяд нерасту практычна ўсе асобіны, што дасягнулі палавой спеласці, імкнуцца мігрыраваць туды, спускаючыся да мора. У той жа час натуральны заход вугра на тэрыторыю краіны з месцаў яго размнажэння практычна перакрыты плацінамі на рэках. Выманне вугра ў гэты час будзе садзейнічаць рацыянальнаму выкарыстанню яго рэсурсаў, тлумачаць у міністэрстве. Вугор раней рассяліўся па азёрах Нарачанскай і Дрывяцкай азёрнай сістэмы, таму, у адпаведнасці з Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, штогод вясной вядзецца прамысловая лоўля гэтай рыбы ва ўсіх вадаёмах, дзе маюцца запасы віду.

Сяргей РАСОЛЬКА.

МУЗЕЙ-ТРАЛЕЙБУС З'ЯВІЎСЯ Ў БРЭСЦЕ

На першы маршрут у горадзе над Бугам выйшаў не зусім звычайны тралейбус. У салоне замест прывычнай нам сацыяльнай рэкламы размясцілі стэнды з асноўнымі датамі і падзеямі гісторыі горада.

Фота Аляксандра ШУЛЬГАНА.

Тралейбус упрыгожваюць таксама паштоўкі 1920-30-х гадоў з краявідамі тагачаснага Брэста. Падчас руху аўдыягід праводзіць гістарычную экскурсію і расказвае пра падзеі, з якімі звязаны будынкі і вуліцы за акном. Прадугледжваецца, што гістарычны тралейбус будзе час ад часу мяняць маршруты і ахопіць гістарычнай асветай большую частку горада.

Гэты сумесны праект Брэсцкі абласны краязнаўчы музей і тралейбусны парк горада падрыхтавалі для Брэста ў гонар яго статусу культурнай сталіцай краіны. Пажадаць тралейбусу шчаслівай дарогі, а пасажырам — любіць і ведаць свой горад прыйшоў **старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.**

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ЗАТРЫМАНЫ ЗА БУЙНЫ ХАБАР

У момант атрымання хабару ў памеры 8 тысяч еўра затрыманы старшыня Уздзенскага райвыканкама і дырэктар ААТ «Уздзенскі аграсэрвіс». Упраўленнем Следчага камітэта па г. Мінску заведзена крымінальная справа.

Супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ГУУС Мінгарвыканкама затрымалі службовых асоб падчас перадачы ім грошай прадстаўнікамі вядомага замежнага вытворцы сельскагаспадарчай тэхнікі за арганізацыю заключэння кантракта і перамогу ў тэндары. Апошнія таксама затрыманы. За атрыманне хабару «асобамі, якія займаюць адказнае становішча, у буйным памеры» і «дачу хабару ў буйным памеры» ўсе затрыманыя размешчаны пад варту, з імі працуюць следчыя.

Святлана БАРЫСЕНКА.

«ЗАМІНІРАВАЎ» СТАЛІЧНЫ КІНАТЭАТР

У мінулую суботу ўвечары трывожнае паведамленне прыйшло ў сталіцу з Баранавіч. Мясцовы жыхар пазваніў там у міліцыю і паведаміў пра мініраванне кінатэатра «Перамога» ў Мінску.

Баранавіцкія праваахоўнікі тут жа перадалі гэтую інфармацыю сваім сталічным калегам. Прыбыўшыя супрацоўнікі міліцыі эвакуявалі з кінатэатра наведнікаў і персанал — агулам 83 чалавекі. Падчас абследавання будынка і прылеглай тэрыторыі групай размініравання выбуховых устройстваў знойдзена не было. У дачыненні грамадзяніна, які патэлефанаваў з інфармацыяй пра мініраванне, праверку і разбор праводзіць Баранавіцкі ГАУС. Гаворка ідзе пра крымінальную адказнасць 47-гадовага фігуранта.

П'ЯНЫ ЗА РУЛЁМ — ПЯТЫ РАЗ

У сталіцы інспектары ДАІ затрымалі нецвярозага кіроўцу-рэцыдывіста. Як потым высветлілася, 37-гадовы мужчына ўжо пяць разоў прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за кіраванне аўтамабілем нападпітку.

— Інцыдэнт адбыўся на чацвёртым кіламетры МКАД. Інспектары ДАІ спынілі «Опель Зафіра» і падчас праверкі дакументаў у кіроўцы высветлілася, што ён пазбаўлены пасведчання за язду ў нецвярозым стане. Да таго ж няўзброеным вокам было відаць, што мужчына «заклаў за каўнер», — паведаміла «Звяздзе» **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска Таццяна СПАДАБАЕВА.** — Падчас медыцынскага агляду ў паветры, што ён выдыхнуў, было выяўлена 2,42 праміле алкаголю. У сваё апраўданне затрыманы толькі і змог патлумачыць, што ўдзень выпіў тры літры піва.

Сяргей РАСОЛЬКА ■

ПЕРШЫЯ Ў БІЗНЕСЕ

У Магілёве ўзнагародзілі пераможцаў і лаўрэатаў у сферы прадпрымальніцкай дзейнасці. Іх імёны будуць занесены на абласную Дошку гонару.

Найлепшыя з найлепшых, тыя, хто актыўна ўдзельнічае ў развіцці розных галін эканомікі і рэалізуе на тэрыторыі вобласці інавацыйныя праекты, робіць адчувальны ўнёсак у бюджэт рэгіёна і стварае новыя працоўныя месцы, — усе яны прымалі шчырыя віншаванні ад кіраўніцтва вобласці і заслужаныя ўзнагароды. Пераможцамі і лаўрэатамі ў 16 намінацыях конкурсу «Найлепшы прадпрымальнік 2014 года па Магілёўскай вобласці» сталі 48 камерцыйных арганізацый і прыватных прадпрымальнікаў.

— Сёння Магілёўская вобласць з'яўляецца лідарам у развіцці прадпрымальніцтва, прыкладам для іншых рэгіёнаў, — адзначыў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Віктар НЕКРАШЭВІЧ.** — Летась у Магілёве з'явілася 1000 новых камерцыйных арганізацый, а агульная іх колькасць перавысіла 9 тысяч. Зараз у вобласці налічваецца 25 тысяч прыватных прадпрымальнікаў, у сферы бізнесу працуе 130 тысяч чалавек — чвэрць ад усіх занятых у эканоміцы вобласці. Уклад у валавы рэгіянальны прадукт малога і сярэдняга бізнесу складае 25%. Сёлета мы плануем давесці гэтую долю да 30%.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Онлайн-размова пра фінансы

У рамках Тыдня фінансавай асветы адбылося анлайн-мерапрыемства «Размовы моладзі па ўсім свеце».

Старшакласнікі са сталічнай гімназіі №27 з дапамогай сучасных сродкаў камунікацыі змаглі пагутарыць анлайн са сваімі равеснікамі з Іспаніі і Расіі. Прычым размова з іспанскімі школьнікамі праходзіла на англійскай мове.

У самым пачатку злучэння з Іспаніяй беларускія школьнікі не маглі схаваць свайго здзіўлення... Справа ў тым, што па той бок экрана іх віталі адны дзяўчаты. Акрамя таго, на ўсіх была аднолькавая школьная форма. Інфармацыя пра тое, што ў Іспаніі ёсць школы з раздзельным навучаннем хлопчыкаў і дзяўчынак і школьная форма з'яўляецца там абавязковай, стала нечаканай для ўсіх навіной. А галоўнай тэмай для размовы былі асабістыя фінансы. Беларускія гімназісты актыўна задавалі і адказвалі на пастаўленыя пытанні. Цікава, што загадзя падрыхтаваныя пытанні і адказы былі адсунуты ўбок і хлопцы захоплена імправізавалі. Гутарка была настолькі актыўнай і ўсе былі так захоплены ёй, што не заўважылі, як хутка скончыўся час, адведзены на размову, і давялося развітвацца...

Мерапрыемства стала магчымым дзякуючы некамерцыйнай Міжнароднай арганізацыі фінансавай асветы дзяцей і моладзі — Children Youth Finance International (CYFI). Арганізатарамі ад Беларусі выступілі Нацыянальны банк і Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Навагрудчына чакае маладых спецыялістаў

Пры гэтым у раёне робяць канкрэтныя крокі ім насустрач, спрабуючы зацікавіць моладзь у выбары свайго першага рабочага месца менавіта тут.

У прыватнасці не абмяжоўваюцца стандартнымі заяўкамі ў навучальныя ўстановы перад размеркаваннем выпускнікоў, а запрашаюць іх да сябе, нават аказваючы транспартную падтрымку. Знаёмяць з прадпрыемствамі і арганізацыямі, жыллёвымі ўмовамі, матэрыяльнымі стымуламі для маладых спецыялістаў. Чарговую сустрэчу з гэтай мэтай аддзел адукацыі, спорту і турызму райвыканкама нядаўна арганізаваў для студэнтаў педагагічнага факультэта Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Ім паказалі ўстановы дашкольнай і сярэдняй адукацыі, сацыяльна-педагагічны цэнтр, яны пабывалі ў музеях, на ўроках беларускай, рускай і англійскай моў, на занятках у трэнажорнай зале. А ў інтэрнаце для маладых спецыялістаў на базе гімназіі №2 будучыя педагогі пераканаліся ў дастойных умовах пражывання: двух- і трохмесныя пакоі ў блоку, кухня, пакой для адпачынку.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ОТЧЕТ

о прибылях и убытках за январь-декабрь 2014 года

Основные средства (01 минус 02)	110	2 900	6 882
Нематериальные активы (04 минус 05)	120	3	4
Доходные вложения в материальные активы (03 минус 02)	130	2 112	
В том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	2 112	
предметы финансовой аренды (лизинга)	132		
прочие доходные вложения в материальные активы	133		
Вложения в долгосрочные активы (08, 07)	140		
Долгосрочные финансовые вложения (06)	150		
Отложенные налоговые активы (09)	160		
Долгосрочная дебиторская задолженность (60, 62, 76 минус 63)	170		
Прочие долгосрочные активы (97)	180		
ИТОГО по разделу I	**190**	**5 015**	**6 886**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	3 493	424
В том числе:			
Материалы (10, 15, 16, 14)	211	207	75
животные на выращивании и откорме (11)	212		
незавершенное производство (20, 21, 23, 29)	213		
готовая продукция и товары (43, 44, 41 минус 42)	214	3 286	349
товары отгруженные (45)	215		
прочие запасы	216		
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации (47)	220		
Расходы будущих периодов (97)	230		6
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам (18)	240		1 896
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	16 976	19 799
Краткосрочные финансовые вложения (58)	260		
Денежные средства и их эквиваленты (50, 51, 52, 55, 57, 58)	270	893	325
Прочие краткосрочные активы (94)	280		
ИТОГО по разделу II	**290**	**21 362**	**22 450**
БАЛАНС	**300**	**26 377**	**29 336**

СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	На 31 декабря 2014 года	На 31 декабря 2013 года
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал (80)	410	6 035	6 035
Неоплаченная часть уставного капитала (75 (75-1) показатель вычитается)	420		
Собственные акции (доли в уставном капитале) (81 показатель вычитается)	430		
Резервный капитал (82)	440		
Добавочный капитал (83)	450	398	499
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) (84)	460	2 148	1 603
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода (99)	470		
Целевое финансирование (86)	480		
ИТОГО по разделу III	**490**	**8 581**	**8 137**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы (67)	510		
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам (76)	520		
Отложенные налоговые обязательства (65)	530		
Доходы будущих периодов (98)	540		
Резервы предстоящих платежей (96)	550		
Прочие долгосрочные обязательства	560		
ИТОГО по разделу IV	**590**		
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы (66)	610		
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620		
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	16 995	19 976
В том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям (60)	631	13 763	16 110
по авансам полученным (62)	632	245	596
по налогам и сборам (68)	633	539	116
по социальному страхованию и обеспечению (69)	634	26	19
по оплате труда (70)	635	60	54
по лизинговым платежам (76)	636	8	13
собственнику имущества (учредителям, участникам) (75, 70)	637	41	41
прочим кредиторам (71, 73, 66, 67)	638	2 313	3 027
Обязательства, предназначенные для реализации (76/7)	640		
Доходы будущих периодов (98)	650	801	1 223
Резервы предстоящих платежей (96)	660		
Прочие краткосрочные обязательства	670		
ИТОГО по разделу V	**690**	**17 796**	**21 199**
БАЛАНС	**700**	**26 377**	**29 336**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 января 2015 года

Наименование показателей	Код строки	За январь–декабрь 2014 года	За январь–декабрь 2013 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	18 419	33 158
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(18 597)	(32 477)
Валовая прибыль (010 – 020)	030	(178)	681
Управленческие расходы	040	(1 122)	(693)
Расходы на реализацию	050	(649)	(774)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050)	060	(1 949)	(786)
Прочие доходы по текущей деятельности	070	200	73
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(239)	(114)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080)	090	(1 988)	(827)
Доходы по инвестиционной деятельности	100	17 335	40 998
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	971	
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102		
проценты к получению	103		89
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	16 364	40 909
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(15 150)	(38 227)
В том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(1 606)	
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	(13 544)	(38 227)
Доходы по финансовой деятельности	120	92	73
В том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	5	72
прочие доходы по финансовой деятельности	122	87	1
Расходы по финансовой деятельности	130	(54)	(31)
В том числе:			
проценты к уплате	131		
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(54)	(28)
прочие расходы по финансовой деятельности	133		(3)
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 – 130)	140	2 223	2 813
Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140)	150	235	1 986
Налог на прибыль (Д99К68)	160	(21)	(365)
Изменение отложенных налоговых активов (09)	170		
Изменение отложенных налоговых обязательств (65)	180		
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) (Д99К68)	190		
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200		
Чистая прибыль (убыток) (± 160 – 170 ± 180 ± 190 – 200-205-206)	210	214	1 621
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	240	499
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230		
Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230)	240	454	2 120
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250		
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260		

Руководитель **С.В.Яконюк**
Главный бухгалтер **Т.Н.Панасюк**

ОАО «СТО КУЗОВОВ»

Учетный номер плательщика: 190632034
Вид экономической деятельности:
Техническое обслуживание и ремонт а/м
Организационно-правовая форма: ОАО
Орган управления:
Юридическое лицо без ведомственной подчиненности
Единицы измерения: млн. руб.
Адрес: 220019, Минская обл., Минский р-н, направление ТЭЦ-4, 3-й пер. Монтажников, 3А-4, к. 7

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2015 г.

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2014 г.	На 31 декабря 2013 г.
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	539	**677**
Нематериальные активы	120	-	-
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
В том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	-	-
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	-	-
Долгосрочные финансовые вложения	150	**3**	**3**
Отложенные налоговые активы	160	**74**	**74**
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**616**	**754**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	**880**	**1042**
В том числе:			
материалы	211	**873**	**1032**
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	-	-
готовая продукция и товары	214	**7**	**10**
товары отгруженные	215	-	-
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	**154**	**6**
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	**3**	**3**
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	**638**	**371**
Краткосрочные финансовые вложения	260	-	-
Денежные средства и их эквиваленты	270	**130**	**416**
Прочие краткосрочные активы	280	-	-
ИТОГО по разделу II	**290**	**1805**	**1838**
БАЛАНС	**300**	**2421**	**2592**

СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	Код строки	На 31 декабря 2014 г.	На 31 декабря 2013 г.
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	38	38
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	-	-
Добавочный капитал	450	915	915
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	-559	(560)
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	-	-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**394**	**393**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	-	-
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**-**	**-**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	-
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	-	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	2027	2199
В том числе:			
поставщикам, подрядчикам и исполнителям	631	1003	900
по авансам полученным	632	517	1051
по налогам и сборам	633	315	47
по социальному страхованию и обеспечению	634	56	49
по оплате труда	635	128	148
по лизинговым платежам	636	-	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	-	-
прочим кредиторам	638	8	4
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	-	-
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**2027**	**2199**
БАЛАНС	**700**	**2421**	**2592**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2014 г.

Наименование показателей	Код строки	На 31 декабря 2014 г.	На 31 декабря 2013 г.
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	11084	12369
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(9241)	(10733)
Валовая прибыль (010-011)	030	1843	1636
Управленческие расходы	040	(2064)	(2056)
Расходы на реализацию	050	-	-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)	060	(221)	(420)
Прочие доходы по текущей деятельности	070	608	634
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(403)	(499)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060 + 070 - 080)	090	(16)	(285)
Доходы по инвестиционной деятельности	100	70	62
В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	-	-
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	70	62
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	-	-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	-	-
В том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	-	-
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	-	-
Доходы по финансовой деятельности	120	352	12
В том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	237	8
прочие доходы по финансовой деятельности	122	115	4
Расходы по финансовой деятельности	130	(641)	(521)
В том числе:			
проценты к уплате	131	-	-
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	-	-
прочие расходы по финансовой деятельности	133	-	-
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130)	140	25	62
Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140)	150	9	(223)
Налог на прибыль	160	(8)	-
Изменение отложенных налоговых активов	170	-	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	-	-
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	-	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-	-
Чистая прибыль (убыток) (±150-160±170±180-190-200)	210	1	(223)
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	-	-
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230)	240	1	(223)
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

ИНФОРМАЦИЯ
об открытом акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 01 января 2015 г.

	Наименование показателя	Един. изм.	С нач. года	За аналогичн. период прошлого года
4.	Доля государства в уставном фонде эмитента	%	0	0
5.	Количество акционеров, всего	лиц	2	2
	в том числе: юридических лиц	лиц	2	2
	из них нерезидентов Республики Беларусь	лиц	0	0
6.	Начислено на выплату дивидендов в отчетном периоде	млн.руб.	0	0
	Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде	млн.руб.	0	0
	Обеспеченность акции имуществом общества	тыс.руб.	109,44	109,17
	Среднесписочная численность работающих	чел.	41	45
9.	Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено 20% и более выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг	техническое обслуживание и ремонт автомобилей		
12.	Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой баланс	26 марта 2015 года		
15.	Сведения о применении эмитентом свода правил корпоративного поведения(только в составе годового отчета)	в своей деятельности общество руководствуется Правилами корпоративного поведения. Порядок работы с реестром владельцев ценных бумаг определен Регламентом работы с реестром		

Руководитель Д.А.Вискушенко
Главный бухгалтер Н.А.Хитрик

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЗА 2014 ГОД

ОАО «Планар-СО»

Вид экономической деятельности: наука
Организационно-правовая форма: ОАО
Орган управления:
Министерство промышленности Республики Беларусь
Единица измерения: млн. руб.
Адрес: г. Минск, пр-т Партизанский, 2/6,
УНП 100104924

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2014 г.

АКТИВЫ	Код стр.	На 31.12.2014	На 31.12.2013
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	70 701	69 571
Нематериальные активы	120	4 642	5 394
Вложения в долгосрочные активы	140	385	356
Долгосрочные финансовые вложения	150	1	1
ИТОГО по разделу I	**190**	**75 729**	**75 322**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	**210**	**42 919**	**26 245**
В том числе:			
материалы	211	5 936	6 101
незавершенное производство	213	36 606	19 736
готовая продукция и товары	214	377	408
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	4 571
Расходы будущих периодов	230	28	27
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	3 633	3 327
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	10 876	14 892
Краткосрочные финансовые вложения	260	10	10
Денежные средства и их эквиваленты	270	205	1 255
ИТОГО по разделу II	290	**57 671**	**50 327**
БАЛАНС (190+290)	**300**	**133 400**	**125 649**
СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	**Код стр.**	**На 31.12. 2014**	**На 31.12.2013**
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	67 746	67 746
Добавочный капитал	450	17 641	17 284
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	4 825	4 412
ИТОГО по разделу III	**490**	**90 212**	**89 442**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	18 129	20 264
Доходы будущих периодов	540	656	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**18 785**	**20 264**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	8 247	903
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	2 439	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	**630**	**13 624**	**15 040**
В том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	6 284	7 392
по авансам полученным	632	3 903	3 894
по налогам и сборам	633	542	843
по социальному страхованию и обеспечению	634	686	648
по оплате труда	635	2 054	1 885
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	-	200
прочим кредиторам	638	155	178
Доходы будущих периодов	650	93	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**24 403**	**15 943**
БАЛАНС (490+590+690)	**700**	**133 400**	**125 649**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь-декабрь 2014 г.

Наименование	Код стр.	За январь-декабрь 2014 г.	За январь-декабрь 2013 г.
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	51 655	62 610
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(39 929)	(52 123)
Валовая прибыль (010-020)	030	11 726	10 487
Управленческие расходы	040	(6 221)	(6 289)
Расходы на реализацию	050	(25)	-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)	060	5 480	4 198
Прочие доходы по текущей деятельности	070	13 706	6 821
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(15 568)	(8 676)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (060+070-080)	090	3 618	2 343
Доходы по инвестиционной деятельности	100	1 821	7 188
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	737	4 063
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	22	18
проценты к получению	103	77	232
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	985	2 875
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(5 178)	(824)
В том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(4 981)	(685)
прочие доходы по инвестиционной деятельности	112	(197)	(139)
Доходы по финансовой деятельности	120	1 504	317
В том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	1 504	317
Расходы по финансовой деятельности	130	(4 050)	(3 866)
В том числе:			
проценты к уплате	131	(2 978)	(2 324)
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(1 072)	(1 542)
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100-110+120-130)	140	(5 903)	2 815
Прибыль (убыток) до налогообложения (090+140)	150	(2 285)	5 158
Налог на прибыль	160	(666)	(866)
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	(29)	(207)
Чистая прибыль (убыток) (150-160+170+180-190-200)	210	(2 980)	4 085
Количество прибыльных организаций	211	-	1
Сумма прибыли	212	-	4 085
Количество убыточных организаций	213	1	-
Сумма убытка	214	(2 980)	-
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	4 034	12 669
Совокупная прибыль (убыток) (210+220+230)	240	1 054	16 754
Базовая прибыль (убыток) на акцию, рублей	250	(263 957)	-

Доля государства в уставном фонде – 0% (0 акций)			
Показатель	**ед. изм.**	**за 2014 год**	**На 31.12.2013**
Количество акционеров, всего	лиц	1	0
в т.ч.юридических лиц	лиц	1	0
Обеспеченность акций имуществом общества	тысяч рублей	90212000	0
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	штук	11291	0

Дата проведения годового общего собрания – 30.03.2015 г.

Аудитор: ИП УНП 190164765 (Местонахождение: 220007 г. Минск, ул. Жуковского, 17-2, зарегистрирована в ЕГР решением Мингорисполкома за №1247 от 31.10.2000 г. УНП 190164765 провела аудит бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Планар-СО» за период с 1 января по 31 декабря 2014 г. По мн

АДКРЫТА ЎСЁ... ДЫ МНЕ ТУДЫ НЕ ТРЭБА!

Даўно гэта было. Мой сынок вучыўся ў Харкаве ў ваенным вучылішчы. І сам, і яго сябры-курсанты вельмі ж любілі мае салодкія піражкі. Дык я, бывала, напяку іх на ўсіх, наладую ў адмысловую пасудзіну — і на самалёт. Раніцай — туды, вечарам — назад. І хутка, і зручна, а ўжо колькі радасці... Ну, уявіце: сын, як віхор, улятае ў пакой для сустрэч, абдымае мяне, падхоплівае на рукі, пачынае кружыць: «Мама, мама прыехала!..» І толькі пасля гэтага ўжо ставіць на падлогу — так бы мовіць, вяртае на зямлю — да размоў, да піражкоў. Хіба ж на такое забудзешся?.. Ды ніколі ў жыцці! Як, дарэчы, і адзін з пералётаў...

Неяк восенню выбралася я ў госці да сына. Лячу, як заўсёды, як мае быць... Але ж праз нейкі час заўважаю, што палёт зацягнуўся: як быццам, прызямліцца ўжо час, а мы ў паветры. Чаму гэта? Нервуемся, хочацца спытаць... А ў каго? Кабіна пілотаў, вядома ж, наглуха зачынена, сцюардэс чамусьці няма...

Адна, праўда, потым з'яўляецца, кажа, што Харкаўскі аэрапорт не прымае, там дрэннае надвор'е, а таму наш самалёт садзіцца ў... Варонежы.

Што тут пачалося — не перадаць! У кожнага ж свае сем'і, абставіны, планы... Сувязі з зямлёй ніякай...

Нехта плача, нехта крычыць... А толку што: самалёт жа не аўтобус — з яго, дзе захочаш, не выйдзеш. Варонеж — значыць Варонеж.

Селі мы там. І, відаць, не адны, бо ў будынку аэрапорта не тое што чалавеку стаць, яблыку не было дзе ўпасці!

Вось і мы там «тусуемся» — нервы палім, думаем, што рабіць: дадому вяртацца — далёка, да Харкава — бліжэй. Але ж на чым да яго дабрацца? Сталі шукаць варыянты. Я, напрыклад, даехала туды толькі назаўтра раніцай і ледзьве жывая...

Што трохі падбадзёрыла — сына пабачыла, піражкамі пачаставала...

Час выпраўляцца дамоў...

Цягніком, думаю, буду калыхацца ўсю ноч. Самалётам жа хутчэй. Але ж я ўжо навучаная: тэлефаную ў Гомель, пытаюся, як там надвор'е. Кажуць: «Цудоўнае!»

Усё, значыць, бяру білет на самалёт, лячу і ўжо, можна сказаць, не мару, а ўвачавідкі бачу, як вось зараз скончыцца гэтае няўдалае падарожжа, як прыеду дамоў, прыму душ, лягу ў свой мяккі ложак...

Так мне ад гэтага добранька, так светла, так радасна... Я не адразу разумею, што там гучыць. Наш самалёт садзіцца ў... Барыспалі?!

Божухна, што ж гэта? Куды нас зноўку занесла? Чаму? Надвор'е ж, казалі, добрае...

Эмоцыі праз край, як той казаў! Аднак — і зноў жа — іншага выйсця няма: збіраем манаткі і панура цягнемся ў аэрапорт.

Карціна там — Варонеж адпачывае: нават у дзверы зайсці няможна. Таму ўвесь наш гурт па цемры вядуць у нейкі не тое клуб, не тое кінатэатр. І ўжо там — халодныя, галодныя, злыя ад поўнай невядомасці, што далей, мы сядзім аж... да абеду наступнага дня. Бо якраз тады нам аб'яўляюць, што самалёт на Гомель усё ж паляціць!

Думаеце, што мы супакоіліся? Якое там! Нават падняўшыся ў паветра, баяліся, што зноў ляцім не туды. Бо спяваў жа Высоцкі: адкрыта ўсё, хоць нам туды і не трэба...

Бог, мусіць, пачуў нашы малітвы: селі ў Гомелі!

Як я сябе адчувала, вярнуўшыся дамоў, перадаць не бяруся!..

І гэта ж мы тады яшчэ не чулі ні пра якія авіякатастрофы. Калі б нешта падобнае ды, крый Божа, зараз? Слабанервовых, баюся, маглі б не далічыцца.

Раіса ВАСІЛЬЕВА,

г. Гомель.

ПАШЛІ ДУРНОГА...

У тое лета ў маіх сяброў, сужэнцаў Валодзі з Марыяй, урадзілі трускалкі. Прычым урадзілі так, што і самі яны ад'еліся, і пачаставалі ўсіх, і варэння наварылі, а ягады ўсё не канчаюцца.

— Ты ж амаль штодня ў райцэнтр на машыне гайсаеш, — казала Марыйка мужу. — Прыхапіў бы вядзерца... Глядзіш, і прадаў бы.

Валодзя, ну вядома ж, не хацеў гэтым займацца: бараніўся, як мог, але аднойчы жонка ўлучыла момант — паставіла ў машыну вядро з клубніцамі. Ну, што тут будзеш рабіць: уладзіўшы ўсе свае справы, пад'ехаў гаспадар да гарадскога рынку, выйшаў з грузавіка, каля ног тое вядро паставіў. І сам стаіць — пазірае.

— Колькі просіш? — запытала ў яго нейкая кабета.

— Дзесяць, — адчаканіў Валодзька лічбу, названую жонкай.

Нешта буркнуўшы сабе пад нос, кабета паплыла далей.

Што здзівіла, іншыя людзі рабілі акурат таксама: пыталіся кошт і праходзілі міма. А таму за паўгадзіны Валодзю збрыдзела быць гандляром, і ён, пачуўшы чарговае «колькі?», не вытрымаў, сказаў сваё:

— Дзесяць...

А праз паўзу дадаў:

— ...Разам з вядром!

...Дахаты ён вярнуўся, можна сказаць, шчаслівы.

— Прадаў?! — весела папыталася жонка.

— А як жа!

— За колькі?

— За дзесяць, як ты і казала.

— Вось добра... А вядро наша дзе?

— Дык з вядром і прадаў.

— Авохці мне! Ну, ці ж не дурань? Ці ж ты не ведаў, што вядро — пустое — каштуе даражэй? — зашумела на Валодзю гаспадыня.

І не хутка сціхла: уляцела мужыку! Але ж з таго часу ён нікому і нічога больш не прадаваў: жонка не прасіла.

Анатоль З.,

г. Мінск.

ЯКАЯ СПРАВА, ТАКАЯ І СЛАВА

Услед за гумарыстам Задорнавым я казала і буду казаць: жыццё на рацэ больш разнастайнае, больш адметнае. Рака вучыць... Ды хоць бы рыбу лавіць. А ўжо колькі прыгод тады!

Пра адну з іх расказаў наш вядомы «казачнік» Пётр: калі ён не брэша, то і я не збрашу.

Гадоў 50 таму рыба ў нас лавілася проста: падчас нерасту паганяе рыбнагляд — і ўсёй бяды. А пасля таго лодак на вадзе, можна сказаць, безліч. Маладзейшыя мужыкі больш на «абшыванках» выплываюць, старэйшыя — на чаўнах (іх і рабіць трэба з розумам, і плаваць — таксама, бо перакуліцца, што раз плюнуць).

Дык вось. Неяк каля Мурачоўкі (гэта рукаў Дняпра) спецыяльная служба паглыбляла дно і рабіла ўсё, як належыць. Гэта значыць, заклала зарад, падпаліла шнур. Пабег агеньчык і...

Як на тое ліха, у гэтыя ж імгненні, — човен з-за кустоў... Дзед Леўка ў ім... І нічагусенькі ўжо не зробіш... Не спыніш, не адменіш... Рванула! І рванула так...

Човен, казалі, падскочыў над вадою метры на два, сам стары — на чатыры, а кепка дзедава — на ўсе шэсць! Дзед крутануўся нібы «ераплан»: узлёт (рукі-ногі ў розныя бакі), потым — пераварот і пікай у ваду.

Мужыкі, што былі на беразе, аслупянелі: усё, маўляў, канцы дзеду Леўку!..

«Ага, счас», як любіць казаць усё той жа Задорнаў. Дзед, нібы паплавок, вынырвае (!) і хуценька грабе да берага.

Мужыкі да яго — распытваюць, абмацваюць... Дзед нікому нічога не кажа... І, падобна, не чуе — рвецца дамоў, ідзе — без старонняй падтрымкі...

Але ж рака тады апусцела: і тыдзень, і два няма на ёй дзеда Леўкі. Мужыкі сталі пагаворваць, што зараз ён і да берага не падыдзе...

Яшчэ раз тыя «ага» і «счас». У хуткім часе пейзаж аднавіўся: выплыў стары на сярэдзіну рэчкі! Нехта з радасці жартаваць: «Во, дзед, табе страху было! Не хутка ачомаўся...» На што Леўка спакойна сказаў: «Міл чалавек, я ж такі дзве вайны прайшоў, розныя кананады зведаў. Гэта ў параўнанні што? Ды проста пукаўка! А чаму так доўга не выплываў? Дык новы човен дзёўб».

Пасля гэтых слоў нашы мужыкі сталі паважаць дзеда Леўку яшчэ болей...

Хоць ён, зрэшты, і так чалавекам паважаным быў. У пойме Дняпра нават назва ёсць «Леўкаў борак».

Соф'я КУСЯНКОВА,

в. Лучын, Рагачоўскі раён.

ДЗІЦЯ ПАДМАНВАЦЬ НЕ БУДЗЕ

Вырашыла я неяк упрыгожыць нашу грубку-ляжанку, а заадно — для ўнука розных звяроў намаляваць. Набрала фарбаў, пэндзляў, вады і, здаецца, прыступіла б ужо да работы, але ж Сашу, думаю, нецікава будзе глядзець, як нехта малюе, яму ж і самому захочацца. А таму дастала я з шуфляды васковыя крэйдачкі, дала дзіцяці: хай, думаю, далучаецца...

Малы, бачу, з ахвотаю. Удваіх, значыць, і шчыруем, ніхто нікому не замінае, абое стараемся. Я дык не на жарт захапіўшыся...

А хлопчыку (яму двух гадоў яшчэ не было), адчуваю, ужо надакучыла на адным месцы сядзець: пачынае круціцца, голас падаваць. Гляджу я на яго і — спачатку — нічога не разумею: Саша не малюе, але ж і крэйдачак у яго няма — ні ў руках, ні побач...

— Дзе яны падзеліся? — пытаюся ў малога.

— У зівоціку, — адказвае той.

— Як гэта — у жывоціку?! Ты іх што — з'еў?

— Не, — лыпае вачыма дзіця.

— Дык дзе ж яны?

— У зівоціку.

— Пакажы язычок.

Слухаецца, паказвае: там нічога такога, усё чысценькае.

— Можа, ты іх за грубку закінуў? — пытаюся.

— Можа...

Узяла качарэжку, з-за грубкі выграбла ўсё, што толькі магла: крэйдачак там няма. Тады я зноў за сваё: «Сашачка, дзе?» І малы таксама ізноў: «У зівоціку».

Гора мне! Не дагледзела дзіця: трэба выклікаць «хуткую». Плачу, але ж пры гэтым цямлю яшчэ, што даўно не садзіла малога на гаршчок...

Здымаю штонікі і...

Не паверыце: камень з душы, бо з іх, з тых самых штонікаў, высыпаюцца... крэйдачкі, якія прыхаваў мой мастак... Трэба разумець, да чарговых «эцюдаў»?

Галіна ЦУМАРАВА

в. Стары Пруд, Чэрвеньскі раён

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

ЯШЧЭ РАЗ ПРА ТЭАТР



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 5. Народны артыст Беларусі, у 1963—1977 гг. саліст Дзяржаўнага тэатра оперы і балета. **6.** Адна з першых пастановак на беларускай мове ў пачатку XX ст. у маёнтку Пятроўшчына пад Мінскам. **12.** Мастацтва пастаноўкі танцаў і балетных спектакляў. **15.** Прамова персанажа п'есы, скіраваная да самога сябе і адпаведна да публікі ў пачатку і ў канцы спектакля. **16.** Жанр вакальна-інструментальнага твора А. Хадоскі «Песні Белай Русі». **17.** Опера Я. Цікоцкага, лібрэта да якой напісаў П. Броўка. **20.** Папярэдні малюнак тэатральных дэкарацый, касцюмаў. **21.** Гераіня камедыі А. Макаёнка «Лявоніха на арбіце», яркі сцэнічны вобраз якой стварыла народная артыстка Беларусі Г. Макарава. **22.** Агульны выхад артыстаў на сцэну перад спектаклем ці ў яго фінале. **23.** Тэлеопера Г. Вагнера. **24.** Класік, чыё імя носіць адзін з нацыянальных драматычных тэатраў краіны. **25.** Оперная прыма Беларусі, у яе рэпертуары — вядучыя партыі ў многіх класічных аперэтах і мюзіклах. **31.** Паэтэса, вершаваны твор якой «Сягонняшнія і даўнейшыя» ў 1917 годзе інсцэніравала Першае таварыства беларускай драмы і камедыі, створанае Фларыянам Ждановічам. **32.** Старадаўні народны вандроўны тэатр. **33.** Крытыка-бібліяграфічны твор, у якім асвятляецца творчая дзейнасць знакамітых акцёраў, рэжысёраў, тэатральных дзеячаў. **37.** Драматычная актрыса і спявачка, працавала ў прыдворных тэатрах М. Агінскага ў Слоніме і К. Радзівіла ў Нясвіжы. **39.** Народны артыст Беларусі, дэбютаваў у Польскім вандроўным тэатры, з 1940 года — на беларускай сцэне, дзе стварыў галерэю яркіх драматычных вобразаў. **40.** Час тэатральных гастроляў.

Па вертыкалі: 2. Заключны эпізод спектакля. **3.** Частка дэкарацыі на сцэне, якая ўяўляе відарыс столі, неба. **7.** Калектыў артыстаў пад кіраўніцтвам У. Галубка, існаваў у 1920—1937 гадах. **8.** Самы высокі мужчынскі голас. **9.** Гераіня камедыі Я. Купалы «Паўлінка», першую пастаноўку якой ажыццявіў у Вільні беларускі музычны драмгурток А. Бурбіса. **10.** Дзеючая асоба спектакля «Каменнае гняздо», ролю яе на сцэне Нацыянальнага драматычнага тэатра імя М. Горкага выканала заслужаная артыстка Беларусі З. Асмалоўская. **11.** Стваральнік першай беларускай оперы для дзяцей «Марынка». **13.** Гарадскі пасёлак на Магілёўшчыне, дзе ў 1918 годзе на аснове драматычнага гуртка быў створаны народны тэатр. **14.** Аўтар папулярнай аперэты «Вяселле ў Малінаўцы», паказанай Дзяржаўным тэатрам музкамедыі Беларусі на маскоўскай сцэне ў 1946 годзе. **18.** Народны артыст Беларусі, выканаўца ролі Несцеркі ў аднайменным спектаклі. **19.** Драматург, які на матэрыяле легенды пра славутую князёўну Рагнеду стварыў п'есу «Палачанка». **26.** Адзін з выразных сродкаў абмалёўкі вобразаў у камедыі. **27.** Перапынак у гучанні музычнага твора. **28.** Беларускі драматург і культурна-грамадскі дзеяч, на тэкст яго п'есы «На Купалле» А. Туранкоў стварыў оперу «Кветка шчасця». **29.** Опера Ш. Гуно, прэм'ера якой на беларускай сцэне адбылася ў 1888 годзе ў Віцебскім музычна-драматычным таварыстве. **30.** Знакаміты празаік, многія аповесці якога інсцэніраваны айчыннымі тэатрамі. **34.** Вядучая партыя ў ансамблі. **35.** Від сцэнічнага мастацтва, на Беларусі ўзнік у сярэдзіне XVIII ст. у прыгонных тэатрах Слуцка, Нясвіжа, Слоніма і іншых гарадоў.

Па дугах: 1. Аднаактовы балет на музыку харэаграфічнай паэмы М. Равеля, пастаўлены ў 1963 годзе. **4.** Выканаўца ролі Васіля Дзятліка ў інсцэніроўцы рамана І. Мележа «Людзі на балоце». **36.** Музычны твор з трох або чатырох частак, розных па свайму характару і тэмпе. **38.** Аўтар драмы «Канстанцін Заслонаў».

Склаў Іосіф КАРПЫЗА, *г. Ляхавічы.*

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 5. Бабіч. **6.** Паказ. **12.** Харэаграфія. **15.** Акцёр. **16.** Кантата. **17.** Апера. **20.** Эскіз. **21.** Луцка. **22.** Парад. **23.** Раман. **24.** Конас. **25.** Гайда. **31.** Бучма. **32.** Балаган. **33.** Нарыс. **37.** Драздоўская. **39.** Стома. **40.** Сезон. **Па вертыкалі: 2.** Фінал. **3.** Сафіт. **7.** Трупа. **8.** Тэнар. **9.** Агата. **10.** Марта. **11.** Пугст. **13.** Краснапольле. **14.** Аляксандрыя. **18.** Фінагіну. **19.** Дуардэ. **26.** Гумар. **27.** Пабуза. **28.** Чарот. **29.** Фаўст. **30.** Быкаў. **34.** Пыліма. **35.** Балет. **Па дугах: 1.** Балеро. **4.** Гарбук. **36.** Саната. **38.** Маўзон.

Даты | Падзеі | Людзі — 31 САКАВІКА

1800 год — нарадзіўся (маёнтак Антокаль) Восіп Іванавіч Сянкоўскі, расійскі вучоны-ўсходазнавец, дыпламат, журналіст, пісьменнік, член-карэспандэнт Пецярбургскай акадэміі навук (1828). Адзін з заснавальнікаў жанру навукова-фантастычнай аповесці ў расійскай літаратуры. Скончыў Мінскую гімназію, Віленскі ўніверсітэт і ў складзе расійскай місіі быў накіраваны ў Канстанцінопаль (Стамбул). Да 1821 года падарожнічаў па Азіі і Паўночна-Усходняй Афрыцы. Авалодаў усімі мовамі арабскага Усходу, асноўнымі еўрапейскімі, кітайскай, тыбецкай, маньчжурскай і мангольскай. У 1822—1847 гадах — прафесар заснаванай ім жа кафедры ўсходніх моў і арабістыкі Пецярбургскага ўніверсітэта. У 1834—1847 гадах — заснавальнік і рэдактар часопіса «Библиотека для чтения», з 1840-га — рэдактар часопіса «Сын Отечества». Супрацоўнічаў з часопісамі «Северный архив», «Северная пчела» і інш. Даследаваў гісторыю старажытнага Усходу, вывучаў арабскую, турэцкую філалогію, перакладаў на рускую мову і выдаваў творы класічнай арабскай літаратуры. Памёр у 1858 годзе.

1889 год — у Парыжы адбылося ўрачыстае адкрыццё Эйфелевай вежы. У гэты дзень канструктар Густаў Эйфель устанавіў на вяршыні вежы французскі сцяг. Сёння канструкцыя Эйфелевай вежы — самая вядомая архітэктурная славутасць Парыжа. Яе ведаюць ва ўсім свеце як сімвал Францыі. Сам жа канструктар называў яе проста «300-метровай вежай». Эйфелева вежа першапачаткова задумвалася як часовае збудаванне. Яна павінна была служыць уваходнай аркай парыжскай Сусветнай выставы 1889 года, якую ўлады краіны вырашылі зладзіць у гонар стогадовага юбілею Французскай рэвалюцыі. Гарадская адміністрацыя Парыжа папрасіла вядомага інжынера Густава Эйфеля ўнесці адпаведную прапанову. Той прапанаваў для разгляду свае чарцяжы 300-метровай жалезнай вежы, якія да гэтага моманту пыліліся ў яго стале. 18 верасня 1884-га Эйфель атрымаў патэнт на праект. У хуткім часе пасля завяршэння работы выставы вежу планавалі знесці. Але ад гэтага збудаванне выратавалі радыёантэны, якія былі ўсталяваныя на самым версе.

1940 год — на ўзбраенне Чырвонай Арміі прыняты Т-34, найлепшы сярэдні танк Другой сусветнай вайны.

Было сказана

Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, пісьменнік, драматург, публіцыст:

Каб вясне прабіць дарогу,
Каб калісь вярнуўся рай, -
Слова праўды, слова Бога
Мусіш слухаць, родны Край!

■ Здарэнні

У ГРОДНЕ СПЫНІЛІ НАРКАДЫЛЕРА

На чыгуначным вакзале праваахоўнікі затрымалі 20-гадовага мінчаніна. Экспертыза паказала, што парашкападобнае рэчыва ў яго багажы — гэта рэагенты для вырабу сінтэтычных курыцельных сумесяў.

Па папярэдніх ацэнках, з гэтай сыравіны можна было вырабіць больш за 20 тысяч доз спайсу. Акрамя таго, малады чалавек прывёз у Гродна вялікую партыю спайсу, які ўжо быў гатовы да ўжывання. Агульны кошт наркотыку складае каля 2,5 мільярда рублёў. Наркадылер таксама пакланаціўся пра мерную лыжачку для расфасоўкі псіхатропных сродкаў і невялікія магніты для размяшчэння доз на металічных прадметах.

Супрацоўнікі ўпраўлення Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці цяпер каардынуюць сваю работу з калегамі ў іншых рэгіёнах, бо ёсць падставы лічыць, што аналагічныя злачынствы гэты юнак учыніў у Мінску і Брэсце. Наркадылера змясцілі ў следчы ізалятар, яму пагражае да 15 гадоў пазбаўлення волі.

Барыс ПРАКОПЧЫК

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

УДАЎСТВО — сацыяльны стан чалавека адносна шлюбу: удовамі і ўдаўцамі звалі тых, у каго памерлі муж ці жонка.

◈ У народнай традыцыі ўдаўство ўспрымалася як негатыўны, непаўнацэнны стан, які забараняў прымаць непасрэдны ўдзел у абрадах сямейна-родавай накіраванасці, такіх як вяселле і радзіны (гэтых людзей не запрашалі быць свацця́й, хроснай маці і г.д.).

◈ Маці ці бацька, якія аўдавелі, не маглі весці пад вянец і сустракаць пасля вянца сваіх дзяцей. Каб не перадаць ім свой лёс, на іх месца абіралі пасаджоных бацькоў. Удаву — «блізкую да смерці» жанчыну, часцей за астатніх запрашалі для ўдзелу ў пахавальным абрадзе: памыць, апрануць памерлага, галасіць у час пахавання.

◈ Пасля смерці аднаго з сямейнай пары існаваў цэлы шэраг рытуальных дзеянняў, якія маглі паспрыяць новаму шлюбу. Так, у час пахавання памерламу мужчыну расшпільвалі гузікі на кашулі, жанчыне развязвалі ўсе вузлы на вопратцы. У той жа час, калі свякроўка не жадала, каб нявестка выйшла замуж яшчэ, яна спецыяльна (наўмысна) зацягвала на целе памерлага сына нітку, пояс ці вузел гальштука.

◈ Новы шлюб удавы пасля смерці мужа асуджаўся аднавяскоўцамі. Казалі: «Той не ведаў бяды, хто не сватаўся да маладой удавы». Удаўца, які застаўся з дзецьмі, таксама не лічылі «зайздросным» жанiхом, пра яго казалі: «Удавец, што разбіты гаршчок».

◈ Паўсюдна існавала павер'е, што тая жанчына, якая возьме шлюб з удаўцом, у якога засталося грудное дзіця, хутка памрэ сама: «Мёртвая жонка не даруе і забярэ да сябе».

◈ Звычайна новае вяселле можна было гуляць пасля заканчэння памінальнага года. У некаторых рэгіёнах жанчынам забаранялася выходзіць замуж на працягу трох гадоў пасля смерці мужа. Для мужчыны гэты тэрмін быў скарочаны: жаніцца можна было пасля 40 дзён, асабліва калі ў яго на ўтрыманні было некалькі дзяцей і вялікая гаспадарка.

◈ У выпадку другога шлюбу вясельны рытуал для удовых людзей не адмянялі, але скарачалі да мінімуму: не наладжвалі дзявочыя вячоркі, нявесце не апраналі вясельны вянок, вэлюм, вясельны строй белага колеру, не патрабавалі пасагу, не запальвалі свечкі ў час вянчання, не пяклі вясельны каравай.

◈ Каб перасцерагчы новую жонку ад хуткай смерці, яе заносілі ў хату праз акно, заходзілі ў хату спінай ці пускалі паперад яе ката.

◈ Калі мужчына-ўдавец браў за жонку дзяўчыну, хлопцы часта выказвалі свае негатыўныя адносіны да яго тым, што наладжвалі так званыя «кашачыя канцэрты», закідвалі такога жаніха старымі лапцямі, крычалі ў яго адрас непрыстойныя выразы і г.д.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	— 6.46	19.43	12.57
Віцебск	— 6.34	19.34	13.00
Магілёў	— 6.36	19.33	12.57
Гомель	— 6.34	19.28	12.54
Гродна	— 7.01	19.58	12.57
Брэст	— 7.04	19.57	12.53

Месяц

Першая квадра 27 сакавіка.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Кірылы, Трафіма.*
К. *Альбіны, Карнэлії, Веньяміна.*

Фота Надзеі БУЖАН.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА +2..+4°С	КІЕЎ +6..+8°С	РЫГА +3..+5°С
ВІЛЬНЮС +3..+5°С	МАСКВА 0..+2°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +5..+7°С

УСМІХНЕМСЯ

— Прывітанне, дружа! Хочаш паглядзець сапраўдную барацьбу двух драпежнікаў? Прыходзь да мяне сёння вечарам.

— А што будзе за шоу?

— Я буду сваёй цешчы ставіць п'яўкі!

Залатое тэлефоннае правіла: спачатку пакладзі трубку, потым каментуй.

— Дарагі, а давай пагуляем у ролевыя гульні?

— Давай!

— Ты шэф-кухар рэстарана, а я сплю.

carlcatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.012. Індэкс 63850. Зак. № 1170.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 30 сакавіка 2015 года.